Пролетарыі ўсіх краін, еднайцеся!

Комуністычная Партыя (большэвікоў) Беларусі

ЗВЯЗДА

Орган ЦК і Мінскага Абкома КП(б)Б

ГОД ВЫДАННЯ XXIV
№ 21 (6903)
НЯДЗЕЛЯ
26
СТУДЗЕНЯ
1941 г.

ЦАНА 10 КАП.

СЁННЯ Ў НУМАРЫ:

Сустрэнем XVIII Усесаюзную партыйную канферэнцыю новымі вытворчымі перамогамі!

Адкрыўся другі ўсебеларускі з'езд хірургаў.

ПАРТЫЙНАЕ ЖЫЦЦЁ: **А. Бірыла, А. Мятліцкі** — Да чаго прыводзіць недацэнка лесазагатовак. **М. Калдобскі** — Вытворчыя пытанні—у цэнтр увагі партыйнай арганізацыі. **Муравейка** — поспех платных лекцый.

НА ТЭМЫ ДНЯ: Сацыялістычнае спаборніцтва школ і настаўнікаў. Аб санітарных станцыях. **А. Астрэйка** — Сказ пра кок-сагыз.

АРТЫКУЛЫ: **Н. Краснабаеў** — Наспеўшыя пытанні. **А. Бялевіч** — Хірург Леміш. **Н. Гіршын** — Эканоміць кожны кіловат электраэнергіі. **А. Салаўёў** — Старшыня сельсовета. **С. Астапаў** — Мая дэпутацкая дзейнасць. **К. Іоселевіч** — Фізаліс — каштоўная гародная культура.

Рыхтавацца да масавай асушкі балот.

ТЭАТР. **С. Нісневіч** — «Пікавая дама» (спектакль у Вялікім ордэна Леніна тэатры оперы і балета БССР).

ЗА РУБЯЖОМ: Англа-германская вайна. — Ваенныя дзеянні ў Албаніі. — Вайна ў Афрыцы. — Да становішча ў Румыніі. — Харчовае становішча Швецыі.

Няўхільна паляпшаць работу палітыка-асветных установаў

У выніку велізарных перамог, якіх асягнуў наш народ пад кіраўніцтвам большэвіцкай партыі і вялікага Сталіна, корані змяніліся аблічча вёскі. З кожным годам павышаецца агульнаадукацыйны і культурны ўзровень калгаснага сялянства.

Калгаснае сялянства дабілася велізарных поспехаў ва ўмацаванні грамадскай сацыялістычнай гаспадаркі, заваявала высокія ўраджаі. Растуць грашовыя даходы калгаснікаў, няспынна паляпшаюцца матэрыяльна-бытавыя ўмовы і рэшта з этым павышаюцца іх культурныя запатрабаванні. Вялікая роля ў задавальненні гэтых запатрабаванняў ускладаецца нашай партыяй на палітыка-асветныя ўстановы сяла. Дом соцкультуры, хата-чытальня, бібліятэка павінны быць цэнтрамі выхаўчай работы на вёсцы. Праз іх павінна пранікаць у масы калгаснага сялянства жывое слова большэвіцкай прапаганды і агітацыі, праз іх калгаснік павінен знаёміцца з поспехамі нашай краіны, з дасягненнямі навукі, тэхнікі, літаратуры і мастацтва, з важнейшымі міжнароднымі падзеямі. Яны павінны развіваць розныя віды народнай самадзейнасці і творчасці.

У лістападзе 1940 года інтэлігенцыя сяла Федзякіна Разанскай вобласці звярнулася да усёй інтэлігенцыі Савецкага Саюза з заклікам уключыцца ў культурна-асветную работу сярод вясковага насельніцтва. Гэты заклік знайшоў гарачае адабрэнне сярод спецыялістаў сельскай гаспадаркі, работнікаў культурнага фронта.

Па сяле разгортваецца зараз велізарная культурна-асветная работа. Вось асобныя прыклады. Згодна рашэння Добрушскага раённага камітэта партыі праведзены куставыя парады сельскай інтэлігенцыі раёна, у якіх прынялі ўдзел больш 400 чалавек. На гэтых парадах абмеркаван зварот федзякінцаў і намечаны канкрэтныя мерапрыемствы па паладжванню культурна-асветнай работы на сяле. Па вопыту федзякінцаў арганізавалі сваю работу мар'інская, жгунабудская і інш. хаты-чытальні. Пры ўсіх хатах-чытальнях, дамах соцкультуры створаны советы, арганізаваны гурткі самадзейнасці, праводзяцца лекцыі і гутаркі.

Вялікую работу праводзіць Дом соцкультуры ў м. Ціхінічы Ратачоўскага раёна. У ім сіламі мясцовай інтэлігенцыі праводзяцца цікавыя даклады, лекцыі, гутаркі па розных пытаннях. Рэгулярна ў Доме соцкультуры дэманстрыруюцца мастацкія фільмы. Драматычны гурток ставіць спектаклі. У бібліятэцы Дома налічваецца больш 2.000 экземпляраў розных кніг. 300 чалавек з'яўляюцца пастаяннымі яе чытачамі.

Актыўна ўключылася ў культурна-асветную работу на сяле інтэлігенцыя калгаса «Чырвоны Кастрычнік» Уэнзенскага раёна. Дырэктар няпоўнай сярэдняй школы тав. Лычкоўскі часта чытае для калгаснікаў лекцыі і даклады на антырэлігійныя тэмы. Настаўнік Махнач кіруе гуртком бягучай палітыкі. Фельчар Сяргейчык арганізавала гурток па аўладанню санітарнай справай. Аграном Крысько і зоатэхнік Шавель знаёмяць калгаснікаў з перадавой агратэхнікай, прапагандыруюць вопыт Усесаюзнай сельскагаспадарчай выстаўкі. Настаўніца Ачапоўская працуе па ліквідацыі непісьменнасці. Інтэлігенцыя калгаса абавязалася ліквідаваць непісьменнасць і малапісьменнасць сярод насельніцтва сяла да 1 мая 1941 года.

Федзякінскі рух усё больш ахапляе калгасную вёску. Няма сумнення, што ён прынясе выдатныя плады.

Неабходна так арганізаваць работу палітасветных установаў, каб яны прыцягвалі да сябе масы калгаснікаў. Нельга ўзняць якасць культурна-асветнай работы без прывядзення ўсёй сеткі гэтых установаў у культурны выгляд. Таму неабходна стварыць утульнасць у хатах-чытальнях і чырвоных кутках, у клубах і дамах соцкультуры, шырока скарыстаць ініцыятыву мясцовых работнікаў.

Не ўсе партыйныя, совецкія і гаспадарчыя арганізацыі надаюць гэтаму пытанню належную ўвагу.

Далёка не ва ўсіх раёнах рэспублікі ўзорна працуюць палітасветныя ўстановы. Дастаткова прывесці некаторыя прыклады. У Халопеніцкім раёне Мінскай вобласці хаты-чытальні і дамы соцкультуры не падрыхтаваліся да зімы. У вёсцы Чэтверня Жлобінскага раёна Гомельскай вобласці клуб не абсталяван, у ім не праводзіцца ніякай культурнай і масава-выхаваўчай работы. Сродкі, адпушчаныя для абсталявання клуба, не скарыстаны па назначэнню. Ва ўсёй Гомельскай вобласці з 170 палітасветустаноў добра падрыхтаваліся да зімы ўсяго толькі 9.

Абавязак партыйных арганізацый, мясцовых Советаў дэпутатаў працоўных, комсамольскіх і профсаюзных арганізацый — сур'ёзна клапаціцца аб паляпшэнні работы палітасветных установаў. Дзейнасць хат-чыталень, дамоў соцкультуры, бібліятэк павінна быць рознастайнай, жывой, цікавай. Яна павінна быць падпарадкавана асноўнай задачы — павышэнню культурнага ўзроўню працоўных калгаснай вёскі, іх комуністычнаму выхаванню.

Міхаіл Іванавіч Калінін, гаворачы аб комуністычным выхаванні працоўных, адзначыў:

«Калгасная вёска... прад'яўляе каласальны попыт на людзей з павышанай культурнасцю. Трактарыст, камбайнер, механік, аграном, зоатэхнік, апрача ведання сваёй непасрэднай работы, абавязан мець хоць элементарную культурнасць. Узяць і іншыя прафесіі, хоць-бы конюха. Параўнаўча не пяжка селяніну быць конюхам пры адным-двух конях. А калі на канюшні 20—40 коней, тут патрабуецца ўжо арганізацыйны вопыт і культурнасць. І так ва ўсіх галінах калгаснай гаспадаркі. Каб рухацца ўперад, патрэбна культура».

Дзейнасць палітыка-асветных установаў павінна быць падпарадкавана вырашэнню практычных задач калгаснага будаўніцтва. Іх работа зараз, у прыватнасці, павінна быць накіравана на ўзорную падрыхтоўку калгасаў да пасеўнай кампаніі. Вопыт стаханаўцаў, іх метады барацьбы за высокі ўраджай, удой, узоры іх работы па вырашчванню новых культур — усё гэта павінна быць прадметам вывучэння і абмеркавання з калгаснікамі ў палітыка-асветных установах.

Каб выканаць задачу павышэння культурнасці калгаснага сяла, нам трэба няспынна клапаціцца аб выхаванні кадраў, у тым ліку кадраў палітасветработнікаў. Павышэнне іх палітычнага і агульнаадукацыйнага ўзроўню мае каласальнае значэнне. Нашы партыйныя арганізацыі абавязаны сур'ёзна займацца падборам і выхаваннем кадраў палітасветработнікаў, не дапускаць частай змены і перакідкі іх.

Забяспечыць высокаякасную работу дамоў соцкультуры, хат-чыталень, клубаў у зімовы час — задача вялікай палітычнай важнасці. Партыйныя, комсамольскія, профсаюзныя і грамадскія арганізацыі абавязаны дапамагчы іх рабоце і дабіцца ператварэння ўсіх палітыка-асветных установаў у сапраўдныя ачагі культуры на сяле.

СУСТРЭНЕМ XVIII УСЕСАЮЗНУЮ ПАРТЫЙНУЮ КАНФЕРЭНЦЫЮ НОВЫМІ ВЫТВОРЧЫМІ ПЕРАМОГАМІ!

★★★

САДРУЖАСТВА ІНЖЫНЕРАЎ І СТАХАНАЎЦАЎ

ДОБРУШ. (Кар. «Звязды»). На фабрычных варотах прымацован шчыт, абрамлены электрычнымі лямпачкамі. На ім напісана: «Калектыў фабрыкі «Герой працы» ўключыўся ў спаборніцтва імені XVIII партыйнай канферэнцыі. Дадзім звыш плана 100 тон паперы і 1 мільён спытканў!».

Да паспяховага выканання гэтай задачы прыкавана ўвага ўсяго трохтысячнага калектыва фабрыкі.

На прадпрыемстве — 765 стахановцаў. Гэта — перадавыя людзі вытворчасці, якія паказваюць высокія ўзоры прадукцыйнасці працы. Іх прадукцыя толькі добрай і выдатнай якасці. За перыяд спаборніцтва на дастойную сустрэчу XVIII партыйнай канферэнцыі 130 рабочых навучыліся стахановскім метадам работы. Рады стахановцаў з кожным днём растуць. Многія брыгады сталі суцэльнастахановскімі.

У выдатным стахановскім руху віднае месца займаюць комуністы. Яны задаюць тон у спаборніцтве.

Пядаўна народны камісар паперовай прамысловасці СССР узнагародзіў значком «Отличнику социалистического соревнования бумажной промышленности» пяць рабочых фабрыкі. Сярод іх — обер-сетачнік трох паперовых машын комуніст Бізюк, які старанным доглядам складаных агрэгатаў забяспечыў высокую прадукцыйнасць працы; механік папяровага цэха комуніст тав. Капецькоў, які шляхам узорнай пастаноўкі планава-папераджальнага рамонту ліквідаваў прастоі машын.

Вядучым цэхам на фабрыцы з'яўляецца папяровы. Гэты цэх за 17 дзён студзеня даў звыш плана 16 тон паперы. За ім ідзе пакамерны цэх. Тут таксама адчуваецца авангардная роля комуністаў. Брыгада сартыроўшчыц, якую ўзначальвае кандыдат партыі тав. Марозава, увесь час перавыконвае план на 20—30 проц. 15 студзеня гэта брыгада дабілася рэкордная выпрапоўкі — дала 152 проц. задання. Не абагнала брыгада Агеевай, выканаўшая задание на 173 проц.

Дрэва-цэлюлозны завод, які нядаўна не спраўляўся з сваімі задачамі, пачаў выдатна працаваць. Штодзённа завод выконвае вытворчую праграму на 150 проц. Узначальвае прадпрыемства інжынер комуніст тав. Бабравікоў.

Вялікі вытворчы ўзлым назіраецца сярод інжынерна-тэхнічных работнікаў фабрыкі. 5-я машына, дзе сетачнікам працуе тав. Зайцаў, доўгі час не выконвала вытворчага задання. Інжынеры Беркман і Пятроў, якія шэфствуюць над гэтай машынай, дапамаглі Зайцаву арганізаваць рабочае месца, расставіць людзей. І вынікі аказаліся бліскучымі — брыгада Зайцава стала сістэматычна перавыконваць план.

Тэхнічная адсталасць асобных нізавых камандзіраў вытворчасці з'явілася прычынай нізкай прадукцыйнасці агрэгатаў. Група інжынераў фабрыкі арганізавала соцыялістычную дапамогу майстрам і брыгадзірам. Яны практыкуюць чытанне лекцый па пытаннях тэхналогіі вытворчасці. Рабочыя рольнага цэха гэтымі днямі праслухалі папулярную лекцыю аб канцэнтрацыі масы, яе размоле. Прачытаў яе начальнік аддзела тэхнічнага кантролю тав. Пятроў. Зараз інжынеры рыхтуюць лекцыі аб планава-папераджальным рамонце і па пытаннях арганізацыі вытворчасці.

ДАДЗІМ КРАІНЕ БОЛЬШ ЛЕСУ!

НАПЕРАДЗЕ 15-ТЫСЯЧНІКІ

БАРАНАВІЧЫ. (Кар. «Звязды»). З гарачым адабрэннем сустрэлі працоўныя вобласці пастанову СНК СССР і ЦК ВКП(б) аб увядзенні платнай працоўнай і гужавой павіннасці на лесазагатоўках. У многіх вёсках адбыліся сходы сялян па пытанню выканання плана загатовак і вывазкі лесу.

Сяляне вёскі Цяты, Шчукінскага раёна, абавязаліся да дня ажрыцця XVIII Усесаюзнай партыйнай канферэнцыі поўнасцю выканаць даведзеныя да іх вытворчыя заданні па рубцы і вывазцы лесу.

Вядомы ўсёй рэспубліцы лесаруб Владзімір Міцкевіч, які загатовіў з брыгадай у мінулым годзе 15 тыс. кубаметраў лесу, цяпер абавязаўся даць 16 тыс. кубаметраў. Сваё абавязацельства ён з лёгкасцю выконвае. Брыгада сістэматычна дае па 3—4, а іншы раз 5 норм.

У Стаўбноўскім лесапрамгасе выраслі і іншыя выдатныя майстры высокай прадукцыйнасці працы. Стаханаўскія брыгады Івана Будзько, Івана Міхно, Карла Куемкі, Ольгі Ермаковіч і многія іншыя амаль штодзённа загатаўляюць па 75 кубаметраў высокасортнага лесу пры норме 25 кубаметраў.

Выдатных вынікаў на лесазагатоўках дабілася таксама брыгада Нікалая Маляўка з Навагрудскага лесапрамгаса. Яна ў бягучым годзе абавязалася загатовіць 17 тыс. кубаметраў лесу, з іх 2.500 кубаметраў да 15 лютага.

Брыгады лесарубаў Пятра Кавальчука, з вёскі Навіна, Навагрудскага раёна, і Івана Рагіловіча, з вёскі Руда-Яворскае, Дзятловіцкага раёна, даюць у сярэднім па 350—400 проц. задання.

Аднак па вобласці становішча з лесазагатоўкамі недавальняючае. Абласць павінна да 15 сакавіка вывезці 894 тыс. кубаметраў лесу і загатовіць 840 тыс. кубаметраў. А на 20 студзеня квартальны план па вывазцы выканан на 6,9 проц., па загатоўцы — на 6,7 проц.

Партыйныя і совецкія арганізацыі раёнаў абавязаны зараз максімальна скарыстаць вытворчы ўздым, выкліканы падрыхтоўкай да XVIII партыйнай канферэнцыі, і накіраваць яго на поўнае выкананне плана першага квартала па загатоўках і вывазцы лесу.

У адказ на пастанову

ПОЛАЦК, 24 студзеня. (БЕЛТА). Калгаснікі раёна з вялікім задавальненнем сустрэлі пастанову СНК СССР і ЦК ВКП(б) аб увядзенні платнай працоўнай і гужавой павіннасці на лесазагатоўках.

23 студзеня на Мала-Сітнянскім механізаваным лесапункце працавала 356 возчыкаў і 206 калгаснікаў-лесарубаў. Гэта амаль у два разы больш, чым у папярэднія дні. Працавалі з вялікім энтузіязмам. Члены сельгасарцелей імені Сталіна, імені Валадарскага, «Акцябр» тт. Багданаў, Тарашкоў, Собалеў і іншыя выканалі нормы на 140—160 проц.

Па-стаханаўску працавалі ў лесе 28 калгаснікаў сельгасарцелі «Чырвонае Лучна» на чале са сваім старшынёй ордэнаносцам А. Барсуковым.

Дзержынцы трымаюць сваё слова

БАБРУЙСК. Дні падрыхтоўкі да XVIII Усесаюзнай партканферэнцыі азнаменоўваюцца стаханаўскімі мацыпнабудаўнічага завода імені Сталіна, дрэваапрацоўчага камбіната, цвейнай фабрыкі імені Дзержынскага, кандытарскай фабрыкі «Чырвоны харчавік» і іншых перадавых прадпрыемстваў горада вытворчымі падарункамі радзіме.

Выдатныя ўзоры соцыялістычнай працы паказвае калектыў швейнікаў. Узятыя абавязацельствы — выканаць да 15 лютага паўтарамесячную праграму на 108 проц. і даць звыш плана прадукцыі на 70 тысяч рублёў — з чэсцю ажыццяўляюцца. Двухдэкадны план у студзені выканан фабрыкай імені Дзержынскага на 110,8 процанта; выпушчана звыш плана прадукцыі за гэты час на 43 тысячы рублёў. У спаборніцтве заваяваў пярэшняства 4-ты цэх, дзе начальнікам комуніст Софія Голант. Гэты цэх выканаў двухдэкадны план на 120 процантаў.

Стаханаўкі пашывачнага цэха тт. Літвінчык і Катчыцкая звае нормы выконваюць на 140—143 процанты, дзве нормы за змену дае стаханаўка тав. Рудзянкова.

Асаблівых поспехаў дабіліся стаханаўцы раскройнага цэха. Яны перабудавалі сваю работу па-новаму. Уведзен безастатачны раскрой па трох асартыментах. Калі раней адыходы складалі 5 процантаў, то з увядзеннем безастатачнага раскрою адыходы знізіліся да 1,5 процанта. Унядрэнне гэтага метада раскрою толькі па 3 асартыментах дасць 50 тысяч рублёў эканоміі ў год.

Л. КУХАРАЎ.

Узнагароджанне работнікаў Цэнтральнага навукова-даследчага інстытута авіяцыйнага маторабудаўніцтва імені П. І. Баранава

Прэзідыум Вярхоўнага Совета СССР за выдатныя поспехі па стварэнню новых тыпаў узбраення для чырвонага Паветранага флота ўзнагародзіў ордэнамі і медалямі СССР 55 работнікаў Цэнтральнага навукова-даследчага інстытута авіяцыйнага маторабудаўніцтва імені П. І. Баранава.

Ордэнам Леніна ўзнагароджаны 3 чалавекі: токар т. С. І. Андрыянаў, начальнік інстытута т. А. В. Кашырын і галоўны канструктар т. В. М. Якаўлеў.

Ордэнам Працоўнага Чырвонага Сцяга ўзнагароджаны 7 чалавек;

Ордэнам Краснай Звязды — 8 чалавек;

Ордэнам «Знак почета» — 12 чалавек;

Медаллю «За трудовую доблесть» — 12 чалавек;

Медаллю «За трудовое отличие» ўзнагароджаны 13 чалавек.

(ТАСС).

ПЕРШАЯ СПРАВА

З лесу да лесу
калгасная вёска
Кліч пераносіць,
пахоплены жвава:
Лесапіленне
і лесаадвозка
Сёння ў рэспубліцы —
першая справа.
Вёсны.
Заняты пасевамі хлеба.
Звозім у свірны
праз доўгую восень.
А нашай радзіме
такая-ж патрэба
Многа мець дубу
і грабу,
і сосен!
Радасна нам —
з беларускага бору
Годна драўніна
куды не паставіць:
З ёю высока
ўзлятаюць маторы.
З ёю ідуць
караблі
акіяніць!
Ясна адно —
матар'ял адмысловы.
Многапатрэбны
для новай будовы;
Варта-ж успомніць
і рэчы малыя —
Столікі,
шафы,
ці крэслы якія!
Гэта-ж
вядомыя ўсім разуменні.
Наш абавязак —
калгаснымі сіламі
Добра з'єднаўшыся
ў дружныя звенні
Выйсці у пушчы
з вострымі піламі.
Наш абавязак
імкнуцца наперад
Скончыць работу,
што вельмі наспела —
Хай між сабою
гавораць сякеры,
Каб, аж над голлямі
рэха гудзела.
— Потым здабыткі
сабраць мы павінны.
Сані і кары
накладываць спорна.
Каб па аснежаных,
зімніх пуцінах
Бесперашыпна
капіліся бёрны.
Хай-жа
барамі ідзе пагалоска —
Кожнай брыгадай
палхопіцца жвава:
Лесапіленне
і лесаадвозка
Сёння ў рэспубліцы —
Першая справа!

Пятрусь БРОЎКА.

Адкрыўся другі ўсебеларускі з'езд хірургаў

Учора ў Мінску, у памяшканні клуба металістаў, адкрыўся другі ўсебеларускі з'езд хірургаў. З гарадоў і раёнаў БССР прыбылі 180 дэлегатаў. У зале таксама прысутнічаюць звыш 200 гасцей—медыцынскіх работнікаў сталіцы БССР.

З'езд адкрыў заслужаны дзеяч навукі прафесар Е. В. Корчыц. У сваім уступным слове ён вітаў дэлегатаў і гасцей, гаварыў аб вялікім значэнні з'езда для далейшага развіцця хірургічнай навукі ў Беларусі. Сваім росквітам, гаворыць праф. Корчыц, медыцынская навука абавязана вялікай партыі Леніна—Сталіна і асабіста мудраму правадыру і настаўніку народаў таварышу Сталіну. З'езд наладжвае доўгую авацыю ў чэсць партыі большэвікоў, у чэсць таварыша Сталіна.

У дзелавы прэзідыум аднадушна выбіраюцца тт. Панамарэнка, Былінскі, Наталевіч, Ванееў, Матвееў, Пузырэў, парком аховы здароўя БССР тав. Кавалёнак, намеснік наркома аховы здароўя тав. Эпштэйн, прыехаўшыя на з'езд прафесары Н. Н. Прыораў (Масква), Н. А. Купрыянаў (Ленінград), В. А. Шаак (Ленінград), А. М. Заблудоўскі (Ленінград), М. А. Топчыбашаў (Баку), М. П. Сакалоўскі (Варонеж), а таксама віднейшыя беларускія вучоныя—акадэмік В. А. Леонаў, заслужаныя дзеячы навукі Е. В. Корчыц і М. Н. Шапіра, прафесары А. Е. Мангейм, В. В. Бабук. В. І. Марзон і інш.

З велізарным натхненнем, пад доўга незмаўкаючыя авацыі, у пачотны прэзідыум з'езда выбраны члены Палітбюро ЦК ВКП(б) на чале з геніяльным правадыром народаў таварышам Сталіным. Авацыі нарастаюць з новай сілай, калі з'езд аднадушна прымае тэкст прывітальнай тэлеграмы вялікаму Сталіну.

З прывітаннямі з'езду ўчора выступілі народны камісар аховы здароўя БССР тав. Кавалёнак, акадэмік В. А. Леонаў (ад Акадэміі навук БССР) і начальнік Санітарнага ўпраўлення Заходняй Асобай Ваеннай Акругі тав. Бухман. На з'ездзе была зачытана прывітальная тэлеграма ад наркома аховы здароўя СССР тав. Міцерава.

Пасля зацвярджэння парадку дня, слова для даклада «Становішча хірургічнай дапамогі ў БССР і шляхі яе далейшага развіцця» атрымлівае намеснік наркома аховы здароўя БССР тав. С. Я. Эпштэйн. Дакладчык на яркіх фактах паказвае, на якой нізкай ступені стаяла медыцынская навука, і ў прыватнасці хірургія, да Вялікай Кастрычніцкай сацыялістычнай рэволюцыі.

За годы совецкай улады дзякуючы няспынным клопатам партыі і ўрада дасягнуты велізарныя поспехі ў развіцці медыцынскай навукі, у развіцці хірургіі. Дзяржава выдаткоўвае каласальныя сродкі на разгортванне сеткі больніц, клінік, амбулаторый, навукова-даследчых інстытутаў. Дакладчык характарызуе пастаноўку хірургічнай дапамогі ў рэспубліцы, гаворыць аб недахопах у гэтай справе. У заключэнне тав. Эпштэйн спыніўся на бліжэйшых задачах хірургіі і ў прыватнасці на пытанні развіцця ваенна-палявой хірургіі.

Учора-ж пачаліся спрэчкі па дакладу.

27 студзеня, у 7 гадзін вечара, у памяшканні Дома партасветы (вялікая зала) адбудзецца гарадскі сход партыйнага, совецкага і гаспадарчага актыва горада Мінска па пытанню — аб рэалізацыі пастановы Соўнаркома СССР і ЦК ВКП(б) ад 9 студзеня 1941 года **«Аб мерапрыемствах па павелічэнню вырабу тавараў шырокага спажывання і харчоў з мясцовай сыравіны».**

Білеты — ў райкомах КП(б)Б.

МІНГАРКОМ КП(б)Б.

ТЭЛЕГРАМЫ

Англа-германская вайна

ГЕРМАНСКІЯ ПАВЕДАМЛЕННІ

БЕРЛІН, 25 студзеня. (ТАСС). Вярхоўнае камандаванне паведамляе, што ўчора германскія тарпедныя катэры ў час разведкі ў раёне Ла-Манша не раз сустракаліся з праціўнікам і вярнуліся на свае базы. З прычыны неспрыяючага падвор'я германская авіяцыя абмежавалася разведкай.

На захадзе ад вострава Крыт у Міжземным моры германскія бамбардыроўшчыкі атакавалі караван непрыяцельскіх суднаў, які ішоў у суправаджэнні ўзмоцненага канвоя. Адзначана некалькі прамых попаданняў бомб у тры буйныя судны. Збіт адзін непрыяцельскі самалёт.

АНГЛІЙСКІЯ ПАВЕДАМЛЕННІ

ЛОНДАН, 25 студзеня. (ТАСС). Афіцыяльна паведамляецца, што аперацыі англійскай авіяцыі супроць ваенных аб'ектаў праціўніка былі за апошні тыдзень значна больш абмежаванымі. Пяць начэй аперацыі зусім не праводзіліся. Больш абмежаваны былі і дзеянні непрыяцельскай авіяцыі над Англіяй. Пяць начэй падрад у Лондане не аб'яўлялася паветранай трывогі. Гэта найбольш доўгае запінша з верасня мінулага года.

Агенцтва Рэйтэр перадае, што 24 студзеня англійская авіяцыя зноў узмоцнена бамбардыравала італьянскія авіябазы ў Сіцыліі, жарыстоўваемыя германскімі пікіруючымі бамбардыроўшчыкамі. Узнікшыя пажары былі відны з вострава Мальта.

У сувязі з германскімі паведамленнямі аб затапленні 16 англійскіх крэйсераў кампетэнтныя лонданскія ваенна-марскія кругі заяўляюць, што за ўсю вайну Англія страціла 4 крэйсеры і 11 дапаможных узброеных суднаў, якія праціўнік змешвае з крэйсерамі.

Італьянская зводка

РЫМ, 25 студзеня. (ТАСС). Агенцтва Стэфані перадае зводку італьянскага камандавання: «Учора днём апошнія італьянскія атрады, якія аказвалі адчайнае супраціўленне атацы праціўніка ў захоўнім сектары Тобрука, павінны былі здацца. У крэпасці Тобрук знаходзіліся адна пяхотная дывізія, адзін батальён пагранічнай аховы і адзін батальён чорнарубашачнікаў, а таксама атрады маракоў і артылерыйскія часці — усяго 20.000 чалавек. Гэтыя сілы на працягу 19 дзён вытрымлівалі бесперапынную бамбардыроўку з сушы, з мора і з паветра, а таксама апошні штурм, які працягваўся 4 дні. Наша артылерыя страляла да апошняга снарада і нанесла вялікія страты аўстралійскім атрадам. Нашы страты людзьмі і матэрыяламі таксама значныя. Згодна паведамленням радыёстанцыі праціўніка, з Тобрука было адпраўлена больш 2.000 раненых італьянцаў. Пасля Тобрука бай перасунуліся на захад, дзе пры падтрымцы нашай авіяцыі, рабіўшай бамбардыроўку і абстрэл з кулямётаў, былі адбіты атакі бронетанкавых часцей праціўніка. Збіт адзін самалёт праціўніка.

На грэчаскім фронце ўмовы надвор'я не спрыялі аперацыям. У часе мясцовых аперацый былі заняты важныя пазіцыі праціўніка, а таксама захвачана значная колькасць палонных і аўтаматычнай зброі.

Ва Усходняй Афрыцы, на фронце Судана, прадаўжаліся баі ў зоне Керу і Айкота.

Учора злучэнні бамбардыроўшчыкаў германскага авіяцыйнага корпуса атакавалі эскадру праціўніка ў цэнтральнай частцы Міжземнага мора.

У Атлантычным акіяне адна з італьянскіх падводных лодак затапіла грэчаскі параход «Элені» танажам у 3.039 рэгістравых бруто-тон.

Другая італьянская падводная лодка затапіла пасля жорсткага бою англійскі дапаможны крэйсер «Омеус» водазмяшчэннем у 7.472 тоны, на якім перавозіліся войскі».

Ваенныя дзеянні ў Албаніі

АФІНЫ, 25 студзеня. (ТАСС). У камюніке грэчаскага камандавання, апублікаваным вечарам 24 студзеня, паведамляецца, што мясцовыя аперацыі завяршыліся паспяхова. Грэчаскімі войскамі захвачана каля 100 палонных.

Газета «Пройа» піша, што ў раёне Тэпелене ўчора прадаўжаліся сутычкі паміж грэчаскімі і італьянскімі патрулямі. У прыбярэжным сектары фронта працяўжаўся артылерыйскі агонь па ўмацаваных пазіцыях праціўніка. Авіяцыя праціўніка дзейнічала пасіўна.

НЬЮ-ЙОРК, 25 студзеня. (ТАСС). Агенцтва Юнайтэд Прэс перадае, што грэчаскія часці прасунуліся праз горы Кераўніа і знаходзяцца на аллегласці 2 міль ад бухты Валона. Грэчаскія і англійскія самалёты падверглі жорсткай бамбардыроўцы порт Дурацо. Нанесены пашкоджанні гавані і прамысловым прадпрыемствам.

За апошнія 3 дні ў розных сектарах цэнтральнага фронта грэкі ўзялі ў палон 530 італьянцаў.

Паводле паведамлення агенцтва Асошыэйтэд Прэс, некалькі італьянскіх часцей адступіла на цэнтральным фронце на поўнач ад Клісуры.

Вайна ў Афрыцы

ЛОНДАН, 25 студзеня. (ТАСС). Газета «Дэйлі мейл» паведамляе, што англійскія войскі нанеслі паражэнне італьянскай кавалерыі недалёка ад вёскі Керу (Эрытрэя). Адзначаецца, што заняцце Керу англійскімі войскамі стварае сур'ёзную пагрозу для італьянскіх камунікацый.

Па словах газеты, англічане аказваюць націск таксама на паўднёвым участку ў напрамку Барэнту, дзе яны ўжо заняялі вёску Айкота.

Агенцтва Рэйтэр перадае, што 23 студзеня камандуючы англійскімі ўзброенымі сіламі на Бліжнім Усходзе генерал Уэйвел зрабіў інспекцыйную паездку ў раён Тобрука. У момант прыбыцця Уэйвела горад усё яшчэ гарэў. Пасля адпачынку англійскія войскі ў адпаведнасці з намечаным планам будуць прасоўвацца далей на захад.

Агенцтва ўказвае, што англійскія судны зараз заняты перакідкай ваеннапалонных з Тобрука ў егіпецкія порты. З моманту падзення Сідзі-Барані ў егіпецкія порты было дастаўлена 54 тыс. палонных італьянцаў.

Прыбыццё Хайле Селасіе ў Абісінію

НЬЮ-ЙОРК, 25 студзеня. (ТАСС). Карэспандэнт агенцтва Асошыэйтэд Прэс, які знаходзіцца ў Абісініі, перадае, што абісінскі негус Хайле Селасіе вылецеў з Хартума на барту англійскага ваеннага самалёта ў суправаджэнні англійскага афіцэра і былога ваеннага міністра Абісініі Раса Каса. Самалёт прызямліўся на сакрэтным аэрадроме, размешчаным на тэрыторыі Абісініі.

Негус, указвае далей карэспандэнт, пакіраваўся ўглыб краіны, каб далучыцца да англійскай ваеннай місіі і англійскіх рэгулярных часцей, якія знаходзяцца на тэрыторыі Абісініі.

ПАРТЫЙНАЕ ЖЫЦЦЕ

Да чаго прыводзіць недаацэнка лесазагатовак

Косаўскі раён з'яўляецца адным з асноўных лесазагатоўчых раёнаў Брэсцкай вобласці. У мінулым годзе ён павінен быў даць больш пятай часткі ўсёй колькасці драўніны, загатаўляемай у вобласці. У раёне ёсць два леспрамгасы. Здавалася-б, што райком і выканком райсавета дэпутатаў працоўных павінны былі-б аддаць максімум увагі лесазагатоўкам. Аднак на справе гэта не так.

18 лістапада мінулага года Брэсцкі абком КП(б)Б, абмеркаваўшы пытанне аб ходзе лесазагатовак у Косаўскім раёне, даў райкому і дырэктарам леспрамгасаў рад канкрэтных указанняў. Але пры праверцы выканання рашэння абкома аказалася, што райком КП(б)Б (сакратар тав. Юшкевіч) і выканком райсавета дэпутатаў працоўных (старшыня тав. Шугаеў) прадаўжаюць недаацэньваць гаспадарча-палітычнае значэнне лесазагатовак і кіруюць імі павярхоўна, несур'ёзна.

Райком не паклапаціўся нават аб тым, каб арганізаваць пры Косаўскім леспрамгасе пярвічную партарганізацыю, хоць для гэтага ёсць усе ўмовы. Члены партыі, якія працуюць у леспрамгасе, знаходзяцца на ўчоце ў іншых партарганізацыях.

Толькі праз 36 дзён пасля пастановы абкома райком сабраўся абмеркаваць дзейнасць Косаўскага леспрамгаса. Прычым, работы яго перад гэтым пісто не правяраў. Таму і па дакладу дырэктара леспрамгаса была прынята неканкрэтная пастанова, якая ніколькі не магла палепшыць работу леспрамгаса.

26 снежня райком абавязаў дырэктара леспрамгаса да канца года поўнасцю выканаць квартальны план, які да таго часу быў выкананы усяго на 40 проц. У рашэнні нічога не гаварылася аб паляпшэнні работы сярод пастаянных кадраў лесарубаў і возчыкаў, у якіх павінны вучыцца сезонныя рабочыя.

Лесарубы прадаўжаюць працаваць пастарынцы. Работа брыгад не арганізавана. Рабочыя не навучыліся карыстацца лучковымі піламі. Возчыкі працуюць таксама па-аднаму, а не ў брыгадах, без навальшчыкаў і звальшчыкаў.

Райком і райсавет дэпутатаў працоўных праходзяць міма ўсіх гэтых фактаў. Пазіцыю неўмяшання ў справу лесазагатовак і лесавывазкі заняла і раённая газета. У газеце зусім не друкуецца матэрыял аб лесазагатоўках.

Не дзіўна пасля гэтага, што раён зрывае выкананне плана загатовак драўніны. Замест 600 лесарубаў у лесе на 18 студзеня працавала толькі 200 і замест 1.500 падвод — толькі 350.

Работнікі леспрамгаса не займаюцца арганізацыяй сацыялістычнага спаборніцтва сярод лесарубаў. Ёсць прыклады, калі дыскрэдытуецца сама ідэя спаборніцтва. У Галкінскай дачы, напрыклад, працуе некалькі брыгад лесарубаў і возчыкаў. Майстар Гардзейка ўзяў на сябе абавязацельства да дня адкрыцця XVIII партканферэнцыі загатовіць 2.200 кубаметраў драўніны і вывезці 1.500 кубаметраў. Але лесарубы і возчыкі, ад якіх фактычна залежыць выкананне гэтага абавязацельства, ад ім нічога не ведаюць.

Ва ўсім раёне няма ні адной брыгады лесарубаў, якая-б узяла на сябе абавязацельства вырубіць у гэтым годзе 15.000 кубаметраў лесаматэрыялаў. А такія людзі, якія маглі-б з гэтым справіцца, у леспрамгасах ёсць. Але яны не арганізаваны, ім аб гэтым руху нічога не расказваюць. Вось чаму прадукцыйнасць працы лесарубаў і возчыкаў усё яшчэ нізкая і, як вынік, зарплата рабочых, працуючых у лесе, значна адстае ад стаханаўскіх заработкаў.

Начальнік Івацэвіцкай канторы Лесхарчганлюг тав. Яніна дагэтуль не арганізаваў раз'язных крам, чайных і пякарань для абслугоўвання лесарубаў і возчыкаў. Арганізаваныя-ж гандлёвыя пункты знаходзяцца на далёкай адлегласці ад месца, дзе працуюць рабочыя.

Недаацэнка райкомам партыі і выканкомам райсавета дэпутатаў працоўных загатовак і вывазкі лесу прыводзіць да сумных вынікаў.

А. БІРЫЛА,
А. МЯТЛІЦКІ,
інструктары прамадзела Брэсцкага абкома КП(б)Б.

ВЫТВОРЧЫЯ ПЫТАННІ — У ЦЭНТР УВАГІ ПАРТЫЙНАЙ АРГАНІЗАЦЫІ

У кастрычніку мінулага года ў вядучым аптычным цэху акулярнай фабрыкі раптам нарушыўся вытворчы рытм. Брак дайшоў да 45 проц.

Партыйнае бюро фабрыкі занялося гэтым пытаннем. Група комуністаў, добра ведаючых вытворчасць, — канструктару тав. Арпу, майстру тав. Журкоўскаму і стаханаўцу-шліфавальшчыку т. Герасімаву было даручана вывучыць прычыны росту браку. Была склікана нарада стаханаўцаў аптычнага цэха.

Неўзабаве прычыны браку сталі зусім ясныя. У цэху мелі месца парушэнні устаноўленай тэхналогіі. Апрацаваны першы бок шкла не пакрываўся лакам, ахоўваючым шкло ад царалін. Апрача таго, павелічэнню браку спрыяла дрэнная захоўванне матэрыялаў. Вылучаная партбюро група комуністаў адзначыла гэта ў сваіх вывадах. Імі-ж былі ўлічаны і прапановы стаханаўцаў.

Пасля гэтага партбюро на сваім пасяджэнні распрацавала рад канкрэтных мерапрыемстваў па паляпшэнню работы цэха. Ажыццявіўшы гэтыя мерапрыемствы, дырэкцыя фабрыкі давяла брак да мінімальных размераў, нават ніжэй нормы, дапускаемай планам.

Гэта — не адзінкавае вытворчае пытанне, якое партыйнае бюро вырашыла і вырашае шляхам мабілізацыі вопыту партыйнай арганізацыі, інжынерна-тэхнічных работнікаў і жывой сувязі з перадавікамі вытворчасці.

Не так даўно партыйнае бюро атрымала рад скарг ад спажыўцоў на тое, што фабрыка выпрацоўвае недастатковую колькасць акуляраў. Гэта паслужыла сігналам к таму, каб заняцца пытаннем далейшага павелічэння выпуску акулярнай оптыкі. Мы мабілізавалі рабочых на барацьбу са стратамі вытворчасці, за адшуканне новых унутрыфабрычных рэсурсаў.

Заклік партбюро аб мабілізацыі ўнутраных рэсурсаў знайшоў гарачы водгук сярод стаханаўцаў і інжынерна-тэхнічных работнікаў фабрыкі. Было ўнесена многа каштоўных прапаноў, якія далі магчымасць шырэй выкарыстаць унутраныя рэсурсы.

Напрыклад, на працягу доўгага часу ў аптычным цэху накаплялісь груды шкла, якое ўжо было ў рабоце і па розных прычынах не падавалася канчатковай апрацоўцы. Інжынер комсамолец тав. Бейлінсон знайшоў новы спосаб апрацоўкі гэтага шкла, якое звычайна выкідалася на звалку. У выніку — за адзін толькі снежань 1940 года было апрацавана каля 30 тысяч кавалкаў шкла, ляжаўшага мёртвым капіталам. Спажыўцы атрымалі дадаткова 15 тысяч акуляраў.

У 1940 годзе фабрыка адчувала вялікія цяжкасці з атрыманнем каляровага метала і іншых вострадэфіцытных матэрыялаў. Гэта акалічнасць прымусіла дырэкцыю і партыйную арганізацыю заняцца адшуканнем замяняльнікаў. Уся грамадскасць фабрыкі была мабілізавана на вырашэнне гэтай праблемы.

Комуністы і ў гэтым пытанні праявілі сваю авангардную ролю. Стаханаўка штампавачнай брыгады кандыдат партыі тав. Вашчыла распрацавала новы метал раскрою бакавых калец да акоў № 1879, што дае вялікую эканомію белай бляхі. Майстар аптычнага цэха член партыі тав. Касарэўскі прапанаваў выкарыстаць адыходы лямца, якія раней ішлі ў утыль, на сшыванне паліравальнікаў. Па яго-ж прапанове быў абсталяван спецыяльны адстойнік для ўлаўлівання дэфіцытнага і дорагакаштоўнага паліруючага матэрыяла — крокуса, які звычайна разам з водой ішоў у каналізацыю.

Многа каштоўных прапаноў па эканоміі метала і іншых матэрыялаў унеслі комуністы майстар т. Багамолава, тэхнік т. Гаўберг, канструктары тт. Арш і Ханін, інжынер Корзюк і іншыя.

Немалую работу правяла партыйная арганізацыя і ў справе далейшага ўздыму прадукцыйнасці працы. Лозунг — з меншай колькасцю рабочых даць краіне больш прадукцыі — агітатары партыйнай арганізацыі неслі ў цэхі, брыгады.

Стаханавец т. Галабурдзін і інжынер тав. Корзюк зрабілі прыстасаванне, якое дае магчымасць паліраваць у барабане аправы адразу цэлымі дзесяткамі (раней кожная аправа паліравалася ў паасобку на паліровачнай шайбе). На працэсе клёпкі электразварачнага шчытка было занята два рабочых: адзін кляпаў, а другі трымаў дэталь. Няўстойлівасць апрацоўваемага шчытка стварала цяжкасці у рабоце. Стаханавец т. Алексеў сканструіраваў для замацавання дэталі нескладаны станок, які дазволіў аслабаніць аднаго рабочага і амаль у два з палавінай разы павялічыць прадукцыйнасць працы на гэтым працэсе. Канструктар член партыі т. Ханін сканструіраваў спецыяльны станок для рэзкі завушнікаў.

Па даручэнню партыйнага бюро група комуністаў-рабочых спецыяльна распрацавала мерапрыемствы па павелічэнню прадукцыйнасці працы. У выніку мы дабіліся на радзе важнейшых вытворчых участкаў павелічэння прадукцыйнасці працы на 10 процантаў.

Вялікая работа, праробленая партыйнай арганізацыяй, дала значны эфект. Па плану 1940 года на фабрыцы павінна было працаваць 970 рабочых, а фактычна працавала 833. План-жа па прадукцыйнасці працы выкананы на 110,15 проц. Рацыяналізатарскія мерапрыемствы далі эканоміі 164 тыс. рублёў.

Адным з найбольш важных мерапрыемстваў, праведзеных не так даўно партыйнай арганізацыяй, з'явілася партыйна-тэхнічная канферэнцыя. На гэтай канферэнцыі комуністы—інжынерна-тэхнічныя работнікі і стаханаўцы фабрыкі — распрацавалі рад мерапрыемстваў па ўнядрэнню перадавой тэхналогіі і далейшаму тэхнічнаму прагрэсу фабрыкі.

На прадпрыемстве шырока разгарнулася сацыялістычнае спаборніцтва на дастойную сустрэчу XVIII Усесаюзнай партыйнай канферэнцыі. Узмацніўся паток рацыяналізатарскіх прапаноў.

Адначасова праводзіцца вялікая падрыхтоўка да асваення трох новых відаў акулярных апраў і двух новых відаў акулярных прамысловага тыпу, а таксама работа па рэалізацыі пастановы Соўнаркома Саюза ССР аб асваенні медыцынскага акулярнага шкла з універсальнай аправай. Ужо прыступлена да канструіравання такой аправы, якая да гэтага часу ў нашай краіне не выраблялася.

Партыйная арганізацыя фабрыкі будзе і далей па-большэвіцку мабілізоўваць увесь рабочы калектыў фабрыкі на паспяховае выкананне задач, якія стаяць перад намі ў 1941 годзе.

М. С. КАЛДОБСКІ,
сакратар партбюро Віцебскай акулярнай фабрыкі.

Пытанні фізкультуры на бюро абкома КП(б)Б

БАРАНАВІЧЫ. (Кар. «Звязды»). Гэтымі днямі бюро Баранавіцкага абкома КП(б)Б абмеркавала пытанне аб становішчы фізкультурнай работы ў вобласці. Бюро прызнала, што, у выніку слабага кіраўніцтва абласнога камітэта фізкультуры і спорта, масава-фізкультурная работа на прадпрыемствах, у калгасах і ўстановах арганізавана дрэнна. У большасці раёнаў адсутнічаюць каткі, лыжныя станцыі.

Бюро абкома намеціла рад мерапрыемстваў па наладжанню фізкультурнай работы. Ствараюцца лыжныя станцыі. Наладжваецца выраб лыж. Кіраўнікі облмясцпрома і облсдрэўхімсаюза абавязаны зрабіць на сваіх прадпрыемствах і ў прамысловых арцелях 13.000 пар лыж з мясцовай сыравіны. Сістэма облпромсаюза павінна вырабіць 12.000 пар мяккіх і півёрдых крапленняў да лыж.

Стаханаўка-сельфактаршчыца 6-га тэкстыльнага камбіната (гор. Беласток) Н. Банашэк, удзельнічаючы ў соцспаборніцтва імені XVIII Усесаюзнай партканферэнцыі, штодзённа выконвае норму на 125 проц.
Фото Т. Кажарынава. (БЕЛТА).

ПОСПЕХ ПЛАТНЫХ ЛЕКЦЫЙ

З жніўня мінулага года ў Палескай вобласці пачалі практыкаваць правядзенне платных лекцый. За першыя чатыры месяцы прачытана 61 такая лекцыя. Іх праслухалі 11.764 чалавекі.

Цікавасць да платных лекцый значна большая, чым да няплатных. У Мазыры, напрыклад, наведваемасць апошніх была зусім нязначнай. На першую платную лекцыю аб міжнародным становішчы ўсе білеты былі праданы за дзень да яе. Прысутнічала больш 800 чалавек. Такім-жа поспехам карыстаюцца і іншыя платныя лекцыі.

Чытанне платных лекцый праводзіцца не толькі ў гаралах і раённых цэнтрах, але і ў сельскіх мясцовасцях. Комуністы і беспартыйная інтэлігенцыя вёскі, якія сур'ёзна працуюць над вывучэннем гісторыі і тэорыі большэвіцкай партыі, праяўляюць вялікую цікавасць да лекцый.

Калінкавіцкі райком партыі арганізаваў нядаўна у м. Юравічы платную лекцыю на тэму «Асноўныя рысы марксісцка-дыялектычнага метада». Юравіцкі, Бярозаўскі і Крышыцкі сельсоветы своечасова былі паведамлены аб тэме лекцыі, дні і часе яе правядзення. Добрая падрыхтоўка забяспечыла яўку — на лекцыі прысутнічала 150 чалавек. Лекцыя прайшла пры вялікай актыўнасці слухачоў. Лектару тав. Шпіцу было задана 15 пытанняў. Характэрна, што на гэту лекцыю слухачы прыбылі за 8—10 кіламетраў.

Платныя лекцыі патрабуюць большай адказнасці за іх арганізацыю, падрыхтоўку і правядзенне як ад райкомаў КП(б)Б, так і ад лектараў. Калі раней лектар выязджаў у раён без папярэдняй праверкі і абмеркавання лекцыі ў лектарскай групе, то зараз падобныя факты зжыты. Значна павысіліся патрабаванні да якасці лекцыі.

Сур'ёзны недахоп гэтай справы заключаецца ў тым, што мала чытаецца лекцый па эканамічных пытаннях, на міжнародныя тэмы, па бягучай палітыцы. Асобныя райкомы партыі яшчэ не з усёй адказнасцю адносяцца да арганізацыі лекцый. У Васілевіцкім раёне лекцыі чытаюцца ў неацопленым клубе, дзе з-за холаду нельга нават зняць паліто. Не лепшае становішча ў Ельскім, Петрыкаўскім і Жыткавіцкім раёнах.

МУРАВЕЙКА,
інструктар аддзела прапаганды і агітацыі Палескага абкома КП(б)Б.

НА ТЭМЫ ДНЯ

СОЦЫЯЛІСТЫЧНАЕ СПАБОРНІЦТВА ШКОЛ І НАСТАЎНІКАЎ

Пасля заканчэння студзеньскіх нарад настаўнікаў ва ўсіх школах рэспублікі пачаліся заняткі. Вялікая армія вучняў і настаўнікаў уступіла ў трэцюю чвэрць вучэбнага года. Гэта вельмі адказная чвэрць, якая павінна паказаць, наколькі нашы школы і настаўнікі рашуча і энергічна ліквідуюць недахопы ў сваёй рабоце, якія мелі месца ў першым паўгоддзі бягучага вучэбнага года.

Трэцяя, прадапошняя, чвэрць павінна стаць пераломнай у жыцці школы, перыядам яшчэ больш напружанай і самаадданай работы.

На студзеньскіх нарадах настаўнікі рашылі ўключыцца ў соцыялістычнае спаборніцтва імені XVIII Усесаюзнай партыйнай канферэнцыі. Зараз разгортваецца соцспаборніцтва паміж школамі і настаўнікамі. Бяруцца канкрэтныя абавязацельствы — прыйсці да дня адкрыцця канферэнцыі з добрымі поспехамі ў вучобе, у паладжванні ўсёй вучэбна-выхаваўчай работы як у школе, так і па-за ёй. Трэба ўсямерна падтрымаць гэты выдатны рух і ініцыятыву настаўнікаў.

Добры прыклад у гэтых адносінах паказаў выканком Брэсцкага абласнога Совета дэпутатаў працоўных. Ён адобрыў ініцыятыву настаўнікаў г. Брэста па разгортванню соцспаборніцтва за хутчэйшае ажыццяўленне закона аб усеагульным абавязковым навучанні і забеспячэнне высокай паспяховасці вучняў. Выканком устанавіў 5 пераходных чырвоных сцягаў для лепшых школ, якія паспяхова выканаюць умовы спаборніцтва, адзін пераходны чырвоны сцяг для раённых аддзелаў народнай асветы. Лепшыя школы і настаўнікі, заваяваўшыя пяршынства ў соцспаборніцтве, будуць занесены ў кнігу пачота пры выканкоме абласнога Совета дэпутатаў працоўных.

Такія мерапрыемствы, заахвочваючыя ўдзельнікаў спаборніцтва, заслугоўваюць усямернага адабрэння і пераймання.

Шырока разгортваецца спаборніцтва школ і ў другіх гарадах рэспублікі. Асобныя школы Мінска, Гомеля, Віцебска прыступілі да ажыццяўлення намечаных ва ўмовах спаборніцтва мерапрыемстваў.

Разгортванне соцыялістычнага спаборніцтва школ і настаўнікаў імені XVIII Усесаюзнай партыйнай канферэнцыі — справа, выключная важнасці. Спаборніцтва з'яўляе магутным сродкам комуністычнага выхавання школьнікаў, павышэння іх ведаў і дасягнення новых поспехаў.

Трэба каб органы народнай асветы, партыйныя, комсамольскія, профсаюзныя і піонерскія арганізацыі школ аддалі гэтаму спаборніцтву максімум увагі, з'явіліся сапраўднымі яго арганізатарамі. Асаблівую дапамогу ў разгортванні соцспаборніцтва неабходна аказаць сельскай пачатковай школе і яе настаўнікам.

Адной з умоў соцыялістычнага спаборніцтва настаўнікаў і школ з'яўляецца паляпшэнне культурна-асветнай работы на сяле. Трэба каб нашы настаўнікі і вучні старэйшых класаў дапамагалі калгасам у паладжванні культработы, былі яе застрэльшчыкамі.

Даб'ёмся ўключэння ў соцыялістычнае спаборніцтва імені XVIII канферэнцыі ВКП(б) усіх школ і настаўнікаў! Заваюем высокую паспяховасць вучняў па ўсіх прадметах!

АБ САНІТАРНЫХ СТАНЦЫЯХ

У Беларусі налічваецца 90 санітарных станцый, з іх — 70 раённых, 17—міжраённых і 3 гарадскіх. Яны праводзяць вялікую санітарна-прафілактычную і процізпідэмічную работу, ажыццяўляюць санітарны нагляд за якасцю харчовых прадуктаў і вады, даюць заключэнні па праектах будаўніцтва і рэканструкцыі гарадоў.

Вось к прыкладу Гомельская санітарная станцыя. Па ініцыятыве яе работнікаў на большасці харчовых прадпрыемстваў горада наведзен ўзорны парадак і чыстата. Старыя работнікі станцыі В. С. Пераплётчыкава, якая працуе на санітарнай рабоце з 1923 года, М. Б. Хаскін—з 1928 года, эпідэміолаг М. Б. Жоўкер праводзяць вялікую карысную работу. Яны заслужана карыстаюцца сярод насельніцтва любоўю і павагай. Славіцца сваёй добрай работай і Бабруйская міжраённая санітарная станцыя.

На вялікі жаль, яшчэ не ўсе станцыі працуюць здавальняюча. І гэтаму перашкаджае рад арганізацыйных непаладжаў. Зусім зразумела, што для правядзення сваёй вялікай работы станцыі павінны мець у першую чаргу матэрыяльна-вытворчыя базы: памяшканні для санітарна-бактэрыялагічных пунктаў, лабараторый, прывівачных пунктаў, санпрапускнікоў, транспарт для перавозкі інфекцыйных хворых, перасовачную і стацыянарную дэзінфіцыруючую апаратуру. Між тым, у асобных раёнах маюць месца абурачыя факты, калі самі органы аховы здароўя забіраюць памяшканні санітарных станцый для іншых мэт. У Чашніках, напрыклад, памяшканне станцыі занята пад больніцу, у Парычах — пад кватэру, у Петрыкаве — пад канцылярыю. У пакоях санітарнай станцыі гор. Вілейкі размясціліся рабочыя-будаўнікі. У вобласці адсутнічае санітарна-бактэрыялагічная лабараторыя. Для правядзення аналізаў едуць у Мінск, што звязана з вялікімі выдаткамі.

Раённыя санітарныя станцыі, іх лабараторыі тэхнічна не аснашчаны. Яны часта адчуваюць патрэбу нават у такіх дробязях, як відалёўскія прабіркі, чашкі Петры, колбачкі, градуіраваныя піпеткі і т. д. Між тым такія нескладаныя прадметы, як чашкі і колбачкі, маглі-б без асаблівых цяжкасцей выраблядь беларускія шклозаводы. Трэба толькі арганізаваць гэтую справу.

Не ўсё добра і з кадрамі для санітарных станцый. Нехапае работнікаў сярэдняга звяна — лабарантак, інструктараў па дэзінфекцыйнай справе.

Не ўзнята на належную вышыню роля санітарных фельчараў. У большасці выпадкаў гэта маладыя, малавопытныя работнікі, якія адчуваюць патрэбу ў павышэнні сваёй кваліфікацыі. Але раённы органы аховы здароўя ніякай дапамогі гэтым ім не аказваюць. У 65 раёнах яшчэ няма прадстаўнікоў дзяржаўнага санітарнага кантроля, не на ўсіх станцыях ёсць урачы.

Партыя і ўрад уздымаюць велізарную ўвагу развіццю санітарнай культуры, расшырэнню сеткі і ўмацаванню санітарных станцый. Неабходна палепшыць ролю гэтых устаноў, умацаваць іх матэрыяльна-гаспадарчую базу, стварыць умовы для нармальнай работы. Гэтай справай павінны сур'ёзна заняцца органы аховы здароўя, райкомы КП(б)Б і выканаўчыя камітэты райсаветаў дэпутатаў працоўных.

СКАЗ ПРА КОК-САГЫЗ

Вясёлы ў калгасе быў сход,
І смеху хапала, і шуму.
«Пасееш ты зерне за плот,
А з зерняці выраспе гума».

Ды ўрэшце рашылі такі
Паслугу зрабіць аграному, —
Засеять за рэчкай грудкі;
Яны-ж непатрэбны нікому.

«Пабачым, што будзе тады,
Хапя і не верым прытодзе,
Вялікай не будзе-ж бяды,
Калі тая гума не ўродзіць».

На тым парашылі усе.
Ды толькі да самага лета
Гамонку вялі пакрысе
Пра гуму дзяды і кабеты.

Глядзелі з смяшком на дзяўчат.
Ды ўпартай была Семяненя. *)
Тым часам пара акурат
Збіраць з кок-сагыза насенне.

Прыехаў якраз аграном.
Дзяўчаты к яму за парадай.
На лядах разгоркі кругом
Палеглі нібыта па градах.

«Даўно ўжо чакаем мы вас.
Пагода занадта сухая.
Нам сорам на пэлы калгас,
А з сорам у выйсця не знаем».

Памог аграном зняць бяду
(А сіла і камень расколе) —
З зямлі адкапалі валу,
Вадою апырсквалі поле.

І ўзняў кок-сагыз лапухі,
Хоць пралы ўлажыць давялося,
Затое карэння мяхі
Сабралі дзяўчаты пад восень.

А гума-ж з карэння таго —
Дзяўчатам падзяка за працу.
Дзяржава дала-ж за яго
Грашыма аж тысяч за дваццаць.

Разводзілі рукі дзяды,
Прыходзілі часта на ляды,
Чакалі напэўнай бяды,
А зараз траве гэтай рады.

Казалі:
Спаўзем з ім уніз,
Трава-ж то — не бульба, не жыта
Вазьмі-ж ты яго, кок-сагыз,
Такі даў калгасу прыбытак,

Што нават ніхто і не сніў,
І думаць ніколі не думаў,
Што ўзлымуць вагу прападні,
А ў полі ды выраспе гума.

Цікавы сабраўся зноў сход.
І смеху хапала, і шуму.
Пасей і дагледзь кок-сагыз, —
Займееш і грошы, і гуму.

Анатоль АСТРЭЙКА.

*) Звеннявая калгаса «Зара Комуны».

Затрымліваюць дастаўку газет

Раённы цэнтр — Рудзенск знаходзіцца ад Мінска на адлегласці не больш адной гадзіны язды. Сувязь са сталіцай добрая. Штодзённа ходзяць паязды дальняга следавання. У далатак да іх ходзяць прыгарадныя. Створаны ўсе ўмовы, каб грамадзяне Рудзенска атрымлівалі мінскія газеты ў дзень іх выхаду.

На справе атрымліваецца інакш. Як правіла, мінскія газеты прыходзяць у Рудзенск на другі дзень пасля іх выхаду. Як асобныя пашчыкі, так і раённая кантора сувязі не раз узнімалі аб гэтым пытанне перад абласным аддзелам распаўсюджвання і экспедыравання перыядычных выданняў, але там абмяжоўваюцца толькі абяцаннямі ўрэгуляваць справу. Газеты-ж пакуль што прыбываюць на другі дзень.

РАДКЕВІЧ.

НАСПЕЎШЫЯ ПЫТАННІ

Паспяховае выкананне дзяржаўнага плана перавозак залежыць не толькі ад работнікаў чыгуначнага транспарта, але і ад работнікаў іншых галін народнай гаспадаркі.

Нарком чыгуначнага транспарта тав. Кагановіч у сваёй прамове на XVIII з'ездзе ВКП(б) гаварыў: «Ёсць яшчэ адзін рэзерв, вялікі рэзерв, на які ўказваў нам таварыш Сталін. Гэты рэзерв — упарадкаванне перавозак, ліквідацыя нерацыянальных сустрэчных і дальніх перавозак. Гэта залежыць і ад самога транспарта і ад кліентуры».

За час, які прайшоў пасля XVIII з'езда ВКП(б), на Беларускай чыгунцы многа зроблена, каб скарыстаць гэтыя рэзервы, каб упарадкаваць перавозкі і ліквідаваць нерацыянальныя сустрэчныя перавозкі. Аднак зроблена яшчэ далёка не ўсё. Некаторыя кіраўнікі прадпрыемстваў за гэтага часу пагаджаюць інтарэсамі транспарта, ставяць свае месніцкія інтарэсы вышэй за ўсё.

За 1940 год кліентура не падрыхтавала да перавозкі грузаў у размеры 20,4 процанта плана. Асабліва нецярпіма адносяцца да выканання сваіх абавязацельстваў перад транспартам асобныя кіраўнікі леспрамгасаў, лесазаводаў і механізаваных пунктаў сістэмы Наркомлеса БССР.

Па прадпрыемствах, якія ўваходзяць у гэту сістэму, за 11 месяцаў план пагрузкі лесаматэрыялаў выканан усяго толькі на 66,3 процанта.

Асіпавіцкім леспрамгасам за гэты час сарвана планавая пагрузка 3099 вагонаў лесу з-за непадрыхтоўкі і непадвозкі грузу. Брожскім механізаваным пунктам не прадпісаўлена 2438 вагонаў. Бабруйскім лесакамбінатам — 1559 вагонаў. Рэчыцкім мехпунктам — 761 вагон. Акцябрскім — 808, Галавіцкім — 609 вагонаў.

Яшчэ больш неўцяшальныя цыфры выканання плана адгрузкі дроў. План пагрузкі дроў за 11 месяцаў мінулага года выкананы усяго толькі на 63 процанты. Клічаўскі леспрамгас сарваў адгрузку 676 вагонаў дроў, Петрыкаўскі — 277 вагонаў, Любаньскі — 421 вагона, Рэчыцкі мехпункт — 307 вагонаў, Бабіцкі — 485 вагонаў.

План пагрузкі торфу па торфзаводах і некаторых прадпрыемствах БССР выкананы на 84,9 процанта. Торфзавод «Свабода» сарваў адгрузку 1595 запланіраваных вагонаў. Міхапавіцкі торфзавод — 923 вагонаў, торфзавод «Татарка» — 696 вагонаў, Гомельскі тлушчакамбінат — 1077 вагонаў, гомельская электрастанцыя — 271 вагона.

Некаторыя кіраўнікі прадпрыемстваў лічаць за лепшае шчодра плаціць вялікія сумы штрафаў, чым клапаціцца аб узорным выкананні дзяржаўнага плана перавозак. За 1940 год кліентурай заплачана чыгунцы 2 мільёны 835 тыс. рублёў штрафа за нарушэнне плана перавозак.

Невыкананнем плана перавозак наносіцца вялікая, непапраўная шкода чыгунцы. З-за неадгрузкі запланіраваных грузаў важнейшыя прамысловыя прадпрыемствы і будоўлі краіны не забяспечваюцца неабходнай сыравінай і поўфабрыкатамі.

Нарушэнне дзяржаўнага плана перавозак прыводзіць да пагаршання работы транспарта, нерацыянальнага скарыстання рухомага састава.

Кліентура не скарыстоўвае сезонных магчымасцей транспарта для ўзмацнення завозу паліва ў гаралы і прамысловым прадпрыемствам БССР. Між тым у летнія месяцы магчымасці чыгункі асабліва вялікія.

Практыка паказвае, што з года ў год летам арганізацыі Наркомлеса і Наркомсаўгаса месцпаліва недагружаюць тысячы вагонаў, а восенню і зімой, калі павялічваюцца перавозкі сезонных грузаў, — хлеба, гародніны, бульбы і інш., яны настойліва патрабуюць пазапланавай падачы вагонаў.

У студзені 1940 года ў суткі грузіліся 282 вагоны торфу, у маі толькі 202 вагоны, а ў чэрвені — 230 вагонаў, у ліпені — 252 вагоны. За суткі ў студзені грузілася 159 вагонаў дроў, у маі — 132 вагоны, у чэрвені — 111 вагонаў і т. д.

Не менш важнае пытанне — гэта правільнае скарыстанне нашых планавых магчымасцей, рацыянальнае скарыстанне транспартных сродкаў.

У рашэннях XVIII з'езда ВКП(б) падкрэслена, што «важнейшай задачай транспарта з'яўляецца ўпарадкаванне планіравання грузаабароту з мэтай усямернага скарачэння дальніх чыгуначных перавозак, ліквідацыі сустрэчных і нерацыянальных перавозак і далейшага павышэння ўдзельнай вагі воднага і аўтатранспарта ў грузаабароце краіны».

Інтарэсы дзяржавы патрабуюць, каб перавозкі планіраваліся рацыянальна, каб не дапускаліся сустрэчныя перавозкі аднародных грузаў.

Між тым, мы маем яшчэ цэлы рад сустрэчных перавозак. Цэглу вязуць з Гомеля ў Мінск, ложкі з Гомеля ў Казань, кандзіцерскія вырабы ў Горкі, Яраслаўль, шкло на Далёкі Ўсход і т. д.

У нас яшчэ не ліквідаваны перавозкі чыгункай на кароткіх аллегласцях, асабліва торфу з Касцюкоўкі і Зяброўкі ў Гомель, з Міханавіч і Сеўчы ў Мінск.

Перавозка хлебных грузаў таксама не ўпарадкавана, ёсць сустрэчныя, лішнія дальнія перавозкі.

Па Беларускай чыгунцы, напрыклад, было адпраўлена на Мінск для далейшага следвання каля 1,5 тыс. тон пшанічнай мукі, у той-жа час з Мінска ў сустрэчным напрамку адгружана 3,5 тыс. тон пшанічнай мукі.

У раёны, размешчаныя па лініі Беларускай чыгункі, было адпраўлена з Мінска 403 вагоны жытняй мукі, у той-жа час паступіла ў Мінск 56 вагонаў.

Ідзе масавы завоз дроў, лесаматэрыялаў, металалому і гародніны на станцыі, з якіх адгружаюцца такія-ж грузы.

Гэта мае месца на станцыях Жлобін, Рагачоў, Мозыр, Будзкашалёўская Новабеліца, Рудзенск, Слуцк, Бярэзіна, Быхаў, Пухавічы і інш.

Прычынай гэтаму тое, што рад гаспадарчых, гандлюючых і снабжэнчых арганізацый БССР не ўпарадкавалі планіравання перавозак.

У Магілеўскую вобласць для райспажыўсаюзаў завозяцца фарфаравыя, жалезаскабяныя, шкляныя, чыгунныя тавары з Аршанскай базы Белкаапсаюза. Гэтыя тавары атрымліваюцца Аршанскай базай з поўдня, а развозяцца яны ў зваротным, па сутнасці, сустрэчным напрамку.

Кантора Галоўметалазбыта ў Мінску атрымлівае метал з поўдня і затым адпраўляе яго ў тым-жа напрамку.

Неабходна пераглядзець спецыялізацыю і месцазнаходжанне размеркавальных баз з тым, каб уніжнуць сустрэчных прабегаў грузаў.

Гаспадарчым арганізацыям неабходна планіраваць перавозкі з улікам рацыянальнасці патокаў грузаў. Трэба правільна і мэтазгодна скарыстоўваць асобныя віды транспарта.

Наша кліентура зусім недастаткова скарыстоўвае водны і аўтагужавы транспарт. Хіба нельга было рэчыцкай і бабруйскай кліентурам перавозіць масавыя грузы на поўдзень па вадзе? Можна, аднак яна гэтага не робіць. Паяўнасць перавозак торфу па кароткія аллегласці гаворыць і аб тым, што аўтатранспарт недастаткова скарыстоўваецца для аслабанення чыгункі ад лішніх перавозак.

Вялікая арганізуючая роля ў гэтай справе належыць Дзяржплану БССР і облпланам на месцах.

Важнае значэнне мае рацыянальнае скарыстанне рухомага састава прамысловымі прадпрыемствамі на пад'язных шляхах, ветках, месцах неагульнага карыстання, дзе грузіцца і разгружаецца каля палавіны ўсяго састава вагонаў.

Аднак работа на гэтых пуцях арганізавана яўна нездавальняюча. Вагоны сістэматычна прастойваюць пад выгрузкай і пагрузкай з-за дрэннай арганізацыі работ, адсутнасці ў многіх выпадках прасцейшых пагрузачна-разгрузачных механізмаў.

За мінулы год па гэтай прычыне кліентурай уплочана чыгунцы 1.676.786 рублёў штрафаў.

Бабруйскі лесакамбінат за дзесяць месяцаў затрымаў 9.711 вагонаў па 29.323 вагона-гадзіны і ўплаціў штрафа 71.764 руб.; Крычаўскі цэментны завод затрымаў 3.803 вагоны на 19.004 вагона-гадзіны, уплаціўшы штрафа 37.840 руб.; Могвалакно затрымала 2114 вагонаў па 7.461 вагона-гадзіну, уплаціўшы штрафа 50.121 руб.

Барацьба з непрадукцыйным скарыстаннем рухомага састава, якая зводзіцца, па сутнасці, да ўплаты кліентурай штрафа, не ласягае мэты.

Некаторыя кіраўнікі прадпрыемстваў карыстаюцца дзяржаўнымі грашыма для аплаты сваёй бяздзейнасці і безадказнасці, а самі астаюцца беспакаранымі. Неабходна сурова караць віноўнікаў прастою вагонаў.

Трэба максімальна механізаваць пагрузачна-разгрузачныя работы, поўнасцю асвятліць месца пагрузкі і выгрузкі, укамплектаваць іх рабочай сілай, арганізацыйна ўмацаваць транспартныя цэхі прадпрыемстваў, палепшыць утрыманне пад'язных пуцей.

Наркаматы і кіраўнікі прадпрыемстваў павінны ўзмацніць барацьбу за павышэнне якасці планіравання перавозак, за рацыянальнае скарыстанне рухомага састава, за добрасумленнае выкананне абавязацельстваў перад транспартам.

Н. КРАСНАБАЎ,
начальнік Беларускай чыгункі.

ЭКАНОМІЦЬ КОЖНЫ КІЛОВАТ ЭЛЕКТРАЭНЕРГІІ

На нарадзе энергетыкаў у Гомельскім гаркоме КП(б)Б.

ГОМЕЛЬ. (Кар. «Звязды»). Магутнасць гарадской электрастанцыі за годы сталінскіх пяцігодак павялічылася ў 30 разоў. Аднак, не гледзячы на такі бурны рост, яна ўсё-ж не задавальняе патрэб прамысловасці горада. Гомельская электрастанцыя даволі часта лімітыруе работу фабрык і заводаў.

Пытанне аб снабжэнні электраэнергіяй прадпрыемстваў не стаяла-б так востра, калі-б кіраўнікі ўсіх прадпрыемстваў, у тым ліку і электрастанцыі, больш беражна расходавалі электраэнергію. Частыя аварыі на электрастанцыі, празмерныя расходы электраэнергіі на ўласныя патрэбы, адсталы стан энергетычнай гаспадаркі на большасці прадпрыемстваў прыводзяць да велізарных страт электраэнергіі. Марна страчанай за 1940 год электраэнергіі з поспехам хапіла-б на забеспячэнне буйнага прадпрыемства.

Рацыянальнае скарыстанне электраэнергіі стала актуальнейшым пытаннем для прамысловасці горада.

Гэта пытанне абмеркавана днямі на нарадзе, скліканай гарадскім камітэтам партыі і выканкомам горсовета. Апрача дырэктараў, галоўных механікаў прадпрыемстваў і работнікаў электрастанцыі на нараду былі запрошаны энергетыкі фабрык і заводаў.

Галоўны інжынер гарадской электрастанцыі тав. Анісімаў прывёў у сваім дакладзе рад фактаў агульнага стану энергетычнай гаспадаркі на некаторых прадпрыемствах. Запушчана, напрыклад, энергетычная гаспадарка завода «Рухавік рэвалюцыі», тлушчакамбіната, мясакамбіната, суднабудаўнічага завода.

Электраправодка ў цэхах не адпавядае правілам тэхнічнай эксплуатацыі. Амаль усюды адсутнічае ўлік расходавання электраэнергіі. За 1940 год, з прычыны неэканомнага расходавання электраэнергіі, прадпрыемствы горада ўплацілі электрастанцыі да 1 мільёна рублёў штрафаў. Тлушчакамбінат уплаціў 128.000 руб., фабрыка «Везувій» — 77 тысяч рублёў.

Існуючая сістэма выплаты прэмій не стымуліруе барацьбы за эканомію электраэнергіі. Некаторыя кіраўнікі прадпрыемстваў дабіліся атрымання прэмій не шляхам прывядзення ў парадак энергетычнай гаспадаркі, а за кошт устаноўкі кандэнсатарных прыбораў. Страты-ж, як і раней, дасягаюць велізарных размераў.

Дакладчык прывёў многа прыкладаў нерацыянальнага скарыстання электраэнергіі ўстановамі горада. Пастанова СНК БССР аб парадку карыстання электраэнергіяй у большасці выпадкаў не выконваецца. Да ліку злосных растратчыкаў электраэнергіі, на жаль, адносяцца горвыканком і выканком абласнога совета. Няхаўна гарадская электрастанцыя вымушана была іх аштрафаваць.

Энергетыкі завода імені Кірава — тав. Банюк і Гомсельмаша—тав. Кавалёў падзяліліся вопытам сваёй работы. Іх прадпрыемствы дабіліся высокага каэфіцыента скарыстання электраэнергіі і сістэматычна атрымліваюць прэміі ад электрастанцыі.

— Увесь «сакрэт» нашых поспехаў,— сказаў тав. Банюк, — заключаецца ў тым, што заводскія арганізацыі сур'ёзна займаюцца справай эканоміі электраэнергіі. У гэту вялікую работу ўцягнуты стаханаўцы і перадавыя людзі завода. У мэтах эканоміі электраэнергіі мы правялі перагрупіроўку электраматораў, устанавілі аўтаматычныя выключацелі.

Замест запланіраванага намі расходавання 105 кіловат электраэнергіі на 100 рублёў гатовай прадукцыі, фактычна расходуецца 101 кіловат. Завод у мінулым годзе атрымаў ад электрастанцыі 55.000 рублёў прэміі.

Тав. Банюк унёс прапанову арганізаваць у Гомелі пункт для абмену матораў, што дасць магчымасць многім прадпрыемствам падабраць электраматоры, адпавядаючыя магутнасці абсталявання. Гэта будзе салідзейнічаць эканоміі электраэнергіі.

Нарада прайшла вельмі ажыўлена. Несумненна, яна прынясе вялікую карысць справе палепшання энергагаспадаркі горада.

Н. ГІРШЫН.



На вагонарамонтным пункце станцыі Віцебск (Віцебская область). Слёсары сярэдняга рамонту — стаханаўцы В. Берэзнікоў (злева) і Л. Казлоў, удзельнічаючы ў соцпаборніцтве імені XVIII канферэнцыі ВКП(б), сістэматычна выконваюць нормы на 200—250 проц.

Фото І. Лосева. (БЕЛТА).



Лепшыя трактарысты ордэнаноснай Дрысенскай МТС (Віцебская область) В. Быкоўскі (справа) і Е. Шырокі, якія выконваюць нормы па рамонту трактараў на 130—160 проц.

Фото І. Лосева. (БЕЛТА).

СТАРШЫНЯ СЕЛЬСОВЕТА

На дварэ стаялі чароўныя ліпеньскія дні. Цяжкім зярном наліло жыта. Даспяваў ячмень, вымятаўся авёс.

Раніцою, калі сонца яшчэ не ўспела ўмыцца крышталёвымі росамі, Антон Фадзеевіч з'явіўся ў сельсовет. Стары конюх Аўпет Мендэль, як звычайна, запытаў:

— Паедзем?

— Паедзем! — коратка адказаў старшыня.

Мендэль, спяшаючыся, вышаў на двор, падмазаў калёсы, кінуў на іх ахапак пахучага сена, запрог каня і, пад'ехаўшы да акна, голасна клікнуў:

— Я гатоў, таварыш старшыня!

Праязджаючы дарогай між шырокіх жытнёвых палёў, Антон Фадзеевіч з захапленнем гаварыў:

— Бачыш, Мендэль, жыта, як сцяна, убраць толькі-б у тэрмін. Будзе хлеб.

Мендэль, разумеючы з першых слоў, што хоча сказаць старшыня, жывей падганяў каня. Лёгкія калёсы быстра каціліся ў напрамку да калгаса.

Старшыню сельсовета калгаснікі сустрэлі гасцінна, засыпалі шматлікімі пытаннямі, расказвалі аб сваіх поспехах. Антон Фадзеевіч у сваю чаргу цікавіўся ходам і якасцю работ, даваў парады.

Ішла ўборка. Калгаснікі прывыклі ўжо да частых візітаў да іх старшыні сельсовета. Пройдзе яких два-тры дні, калі старшыня не прыязджае, і калгаснікі непакояцца.

— Нешта-ж нашага тав. Клепача не відаць, ці не перавялі яго толькі кудынебудзь, чалавек ён з галавой.

А тав. Клепач заўсёды быў там, дзе не ладзілася работа, дзе марудна ішла ўборка ўраджаю, была слаба наладжана прапоўная лысцыпліна. Збярэ люцзей, пагаворыць з імі, уважліва выслухае кожнага, вырашыць недахопы і ўкажа, як лепш выправіць іх. Антона Фадзеевіча можна было бачыць і па калгасным гумне, дзе гудзелі малатарні, і на жывёлагадоўчых фермах, і на палях, дзе ішла ўборка бульбы, і на лугах, дзе праводзіўся другі ўкос траў.

— Кіраўнік павінен быць там, дзе працуюць людзі, — гаворыць тав. Клепач. — На месцы, у вёсках, заўсёды сустракаешся з актывам, бачыш яго работу, дапамагаеш яму. Ёсць пагаворка: алзін у полі — не воін. А да яе трэба дадаць: адзін без актыва — не кіраўнік. Актыў — наша сіла, апора.

* * *

Часта да старшыні сельсовета заходзяць наведвальнікі. Адны па асабістых справах, другія па грамадскіх.

Старэнькі дзед з вёскі Зарубічы прышоў у сельсовет з просьбай дапаматчы яму дастаць кулявой саломы для пакрыцця даху.

— Саломка-то ў мяне ёсць, але яна вягодна для даху. А ў нас там засталося крыху панскай. Ці нельга атрымаць некалькі кулёў?

Антон Фадзеевіч уважліва выслухаў зелянціна і напісаў члену сельсовета службовую запіску, у якой прапанаваў задаволіць просьбу дзядулі.

— А пяпер, — звярнуўся Антон Фадзеевіч да дзеда, — можаце пад'ехаць дамоў на машыне, якая пойдзе ў вашу вёску.

Стары шчыра падзякаваў старшыню і вельмі задаволены пайшоў да машыны.

Па разнастайных пытаннях прыходзяць сяляне да старшыні сельсовета. Жыхар вёскі Пракаповічы прышоў параіцца, як-бы лепш і хутчэй пабудаваць лазню.

— Абрылла нам мыцца ў начоўках. Народ наш любіць венічкам папарыцца, а лазні няма.

Садоўнік калгаса «Свабодная Беларусь» тав. Лазар прыехаў прасіць старшыню сельсовета, каб ён дапамог дастаць саджанцы яблынь, груш, сліў.

— Хочам пасадзіць малады садок, — гаворыць тав. Лазар. — А дзе дастаць саджанцы, — самі не велаем.

Антон Фадзеевіч пазваніў у райземадзел, даведаўся, дзе ёсць саджанцы, а потым расказаў садоўніку.

У свой Індурскі сельсовет сяляне ідуць з упэўненасцю, што змогуць тут вырашыць любое хвалюючае іх пытанне.

Старшыня выканкома сельсовета Антон Фадзеевіч Клепач выбран дэпутатам раённага совета.

Разам са сваім актывам ён дабіўся таго, што Індурскі сельсовет па правядзенню гаспадарча-палітычных кампаній займае першае месца ў раёне.

А. САЛАУЕЎ.

Гродненскі раён.

ДЗЯЎЧАТЫ ВЫВУЧАЮЦЬ ТРАКТАР

БЕЛАСТОК. (Кар. «Звязды»). Пры 16 машынна-трактарных станцыях абласці арганізаваны курсы па вывучэнню трактара без адрыву ад вытворчасці. На курсах займаецца 177 чалавек, у тым ліку 143 дзяўчыны. Пры Беластоцкай МТС навучаюцца 12 дзяўчат, пры Чыжоўскай —13 і т. д.

Восем работніц Граеўскай гумава-тасёмачнай фабрыкі пажадалі вывучаць трактар. МТС пайшла ім насустрач і арганізавала гурток.

ТЭАТР

„ПІКАВАЯ ДАМА"

(Спектакль у Вялікім ордэна Леніна тэатры оперы і балета БССР)

Наўрад ці можна назваць яшчэ адну оперу з усяго велізарнага багацця сусветнай операй літаратуры, дзе з такой дасканаласцю і непераўзыйдзеным майстэрствам была-б прадстаўлена глыбокая псіхалагічная праўда, як гэта мае месца ў геніяльным творы Чайкоўскага — оперы «Пікавая дама», у гэтай трагедыі страсці, трагедыі двух істот, гінучых з-за праці шчасця.

Пранікнуць у творчы замысел кампазітара ў «Пікавай даме», гэта значыць перш за ўсё асазнаць цеплыню і чалавечнасць перажыванняў яе герояў, паказаць шчырае і праўдзівае, глыбокае і моцнае пачуццё кахання Лізы, страчанае і знойдзенае чалавечае дастоінства Германа. Гэта, нарэшце, правільнае раскрыццё сімфанічнай каўвы музыкальнага матэрыялу. І калі оперны тэатр яшчэ не поўнасцю ажыццявіў творчыя замыслы кампазітара, то ўсё-ж ахапляе радаснае пачуццё пры відзе абноўленай пастаноўкі оперы (пастаноўшчык В. М. Шахрай).

Калектывам тэатра прароблена вялікая работа, а гэта залог для ажыццяўлення намечанай мэты. Ясна, што тэатр стаіць на правільным шляху і, не гледзячы на рад непахопаў, рост выканаўчаў як у вакальных, так і ў спэнічных адносінах— у паяўпасці. Па прэм'еры «Пікавай дамы» выдатна выконвала партыю Лізы народная артыстка СССР Л. П. Александроўская. Гэту партыю выконвае і заслужаная артыстка БССР С. Ю. Друкер. Яна таксама ўладае чароўным голасам і свабодна пераадольвае ўсе пяжкасці гэтай складанай партыі. Яна стварае выразны вобраз, поўны драматызма і парыву. Хочацца толькі адзначыць, што месцамі артыстцы пехапае лірызма. Так, напрыклад, у 2-й карціне, дзе яна пяе «О, слушай, ночь», — недастаткова адчуваецца лятуценне, светлай мары аб радасці кахання.

Артыст Н. А. Лазараў вельмі прыкметна і непарыўна расце. Аднак, трэба адзначыць, што, не гледзячы на добрыя спэнічныя і вакальныя ланыя, ён яшчэ поўнасцю не стварае вобраза Германа, адчуваецца яшчэ непераадоленая скаванасць у 1-й карціне і ў фінале оперы. Некалькі пераігрывае» ён у спэне ў казарме (рэжысёрска неапрацована падана яго чытанне пісулькі ля цёмнага акна, калі ў пакоі гарань свечы). Затое вельмі добра іграе Лазараў у 2-й карціне (аб'яснение з Лізай) і ў 4-й карціне (у спальні графіні).

Партыю графіні добра выконваюць артысткі В. Ф. Валчынецкая і В. К. Пукст. Аднак, артыстцы Пукст удаўся гэты вобраз не ўсюды адналькава добра. Месцамі ў яе занята быстрая і ўпэўненая паходка (напрыклад, на балу), мала старэчай пядужасці і ў выкананні песні. Разам з тым вельмі добра прыдумана ёю спэна з Германам (у спальні), асабліва момант смерці, а таксама паяўленне ў выглядзе злаці ў казарме.

Чароўны вобраз жыццерадаснай, лукавай дзяўчыны Паліны стварае артыстка Г. І. Цэлава. Удалы вобраз Томскага ў выкананні артыстаў В. В. Калінаўскага, В. І. Таланкіна і Д. Н. Салохіна. Томскі ў іх выкананні весяльчак, балатур.

Заслужаны артыст рэспублікі М. І. Дзянісаў (князь Елецкі) з вялікім дастоінствам выконвае сваю арыю ў 3-й карціне (на балу), але ён неяк мала прыкметны ў оперы.

Артысты Лапанін (Чэкалінскі) і Сімата (Сурын), не гледзячы на вакальна добра выкананыя партыі, спэнічна яшчэ не аформлены і выглядуць сябе, як два блізняты.

Чулліва-выдатна артыстка Д. З. Кроз у ролі Прылепы—яна пакарае цеплынёй выканання і спэнічнай адпаведнасцю свайго аблічча — пяшчотнай пастушкі.

Дырыжор — заслужаны дзеяч мастацтваў П. Б. Грубін — удумліва і чула вядзе аркестр, раскрываючы і дапамагаючы раскрыць салістам музыкальныя характарыстыкі персанажаў оперы. Месцамі, праўда, пехапае страснасці і парыву (напрыклад, інтрадукцыя). Асабліваю ўвагу хочацца звярнуць на стройнае гучанне хораў (хормейстар — заслужаны артыст А. А. Бельскі), выдатна пастаўленыя масавыя спэны, напрыклад, гуляпне ў парку, бал.

Вялікай увагі заслугоўвае пастаноўка інтэрмедыі ў 3-й карціне (балетмейстар О. Н. Сталінскі).

Асабліва юбрае афармленне спектакля мастака С. Ф. Пікалаева. Пышныя і, разам з тым, строгія, халодныя дэкарацыі з'яўляюцца яркім кантрасным фонам, на якім разыгрываюцца гарачыя страсці. Нават апраўданым здаецца афармленне 1-й карціны — некалькі шэраватыя тоны парка, на якіх асабліва добра вызываюцца пышныя касцюмы екацерынінскай эпохі. Пропістаўленне фона, на якім працякае дзеянне, з замін дзеяннем правядзена афарміпелем на працягу ўсяго спектакля найлепшым чынам і заслугоўвае ўсяляких пахвал.

Новая пастаноўка «Пікавай дамы» паказана шырокаму гледачу ўжо не раз. З кожным новым спектаклем выканаўцы ўсіх саставаў усё больш і больш уласкальваюць свае партыі.

С. НІСНЕВІЧ.

МАЯ ДЭПУТАЦКАЯ ДЗЕЙНАСЦЬ

Прайшло больш трох год з таго часу, як выбаршчыкі Гомельскай сельскай выбарчай акругі ўдастоілі мяне высокай чэсці — выбралі дэпутатам Вярхоўнага Совета СССР. Дні выбарчай кампаніі, хвалюючыя сустрэчы з выбаршчыкамі, іх патрыятычныя прамовы на ўсё жыццё астануцца ў маёй памяці.

Выконваючы ўказанне правадыра, я падтрымліваю цесную сувязь са сваімі выбаршчыкамі, адчуваюся перад імі ў сваёй дэпутацкай дзейнасці.

Аб рабоце гістарычнай VII Сесіі Вярхоўнага Совета СССР, якая прыняла народы прыбалтыйскіх краін у вялікую совецкую сям'ю, я адчуваўся па радыё перад выбаршчыкамі Гомельскай абласці, выступаў з дакладам перад рабочымі Гомельскага паравознага дэпо.

За прайшоўшыя тры годы я атрымаў ад сваіх выбаршчыкаў каля тысячы пісем. Яны звярталіся да мяне па розных пытаннях калгаснага жыцця, з просьбамі і скаргамі асабістага парадку.

Я стараюся чула адносіцца да кожнага пісьма, кожнай просьбы выбаршчыкаў, бо чулыя адносіны да людзей, да скарг іх— закон для совецкага дэпутата. Я імкнуся даць на кожнае пісьмо вычарпальны адказ і прыняць меры да зжыцця недахопаў, задавальнення просьб выбаршчыкаў.

Нядаўна я атрымаў скаргу ад двух выбаршчыц — Марыі і Арыны Тарасенка. Яны пісалі аб тым, што ім не заплацілі за зданае праз'іва. Я звязаўся з канторай Гомтэкстыль і выясніў, што там згубілі іх дакументы. Дакументы былі адноўлены, і сёстры Тарасенка атрымалі належачыя ім грошы.

Жыхар Стаўбунскага сельсовета Сяргей Халюкоў пацярпеў ад пажару. Атрымаўшы пісьмо аб гэтым, я звязаўся з раённымі арганізацыямі, калгасам, і Халюкову была аказана дапамога ў пабудове новага дома.

Грамадзянка Хрупкіна напісала мне аб цяганіне з выдачай ёй дапамогі па многадзетнасці. Звязаўшыся з выканкомам Уваравіцкага раённага совета, я дапамог Хрупкінай у атрыманні дапамогі.

Настаўнік Малоненкаўскага сельсовета, Свяцілавіцкага раёна, тав. Цішкоў прыслаў мне пісьмо, у якім ён абвінавачваў старшыню калгаса тав. Каменева ў разе антыпартыйных спраў. Гэта пісьмо я неадкладна накіраваў у райком партыі з просьбай дакладна расследаваць яго. Праверка паказала, што Цішкоў напісаў паклёпніцкую заяву. Прад'яўленыя тав. Каменеву абвінавачанні не пацвердзіліся. За паклёп Цішкоў прыцягнут да адказнасці.

Многа пісем я атрымаў ад работнікаў дэпо чыгункі і працоўных Гомеля. Члены арцелі «Перамога» прасілі аказаць ім дапамогу ў адгрузцы сыравіны з Бажу. Я накіраваў туды спецыяльнае пісьмо з просьбай паскорыць адгрузку.

Побач з дапамогай выбаршчыкам у вырашэнні раду хвалюючых іх пытанняў, я выконваю асобныя заданні Прэзідыума Вярхоўнага Совета БССР. Нядаўна, па даручэнню Прэзідыума, я азнаёміўся з работай Гомельскага гістарычнага музея, звязаўся па гэтаму пытанню з абласным камітэтам партыі.

Цесная сувязь з выбаршчыкамі садзейнічае майму росту, улівае ў мяне новыя сілы.

Трэці год я працую намеснікам начальніка дэпо па манеўроваму парку паравозаў. Ад іх работы ў многім залежыць нармальны рух паездоў. На гэтых паравозах працуюць у большасці маладыя машыністы, толькі нядаўна атрымаўшыя права кіраваць лакаматывам. Увесь свой вопыт, свае веды я перадаю ім, вучу іх майстэрска кіраваць паравозам, эканомна расходаваць паліва.

Перадавым у нас з'яўляецца лакаматыў, на якім працуюць комсамольцы Ліўшыц, Клімовіч, Раўскі. Іх выдатную работу я стаўлю ў прыклад усім паравознікам, арганізую перадачу іх вопыту.

На працягу 1940 года 72 машыністы нашага дэпо за безаварыйную работу атрымалі наркомаўскую прэмію. З іх 54 чал. працуюць на манеўровых паравозах. «Вузкім» месцам у нашай рабоце з'яўляецца перапал паліва.

У спаборніцтве імені XVIII партканферэнцыі мы накіравалі асноўную ўвагу на дасягненне максімальнай эканоміі паліва.

С. П. АСТАПАЎ,
дэпутат Вярхоўнага Совета СССР, намеснік начальніка дэпо Гомель.

Рыхтавацца да масавай асушкі балот

БУДЗЕ АСУШАНА 13 ТЫСЯЧ ГЕКТАРАЎ БАЛОТ

ГОМЕЛЬ. (Кар. «Звязды»). У калгасах Гомельскай абласці прадаўжаецца абмеркаванне пісьма калгаснікаў сельгасарцелі «Ударнік». Бягомльскага раёна, аб падрыхтоўцы да масавай асушкі і асваення новых зямель.

У Гомельскай абласці многа непрахожных балот, якія ў недалёкім мінулым з'яўляліся ачагамі малярыі. Ужо ў 1940 годзе праведзены значныя работы па асваенню вялікіх балотных масіваў. Пракладзен 87-кілометравы магістральны канал. Праведзена інтэнсіўная асушка 12.893 гектараў балотных зямель.

Пасевы на асушаных землях даюць высокія ўраджаі і прыносяць калгаснікам велізарныя даходы. Толькі ў 1940 годзе асвоена звыш 9 тысяч гектараў балотных зямель. Калгас «Чырвоная Уза», Гомельскага раёна, з асушанай плошчы ў 6 гектараў зняў ураджай аўса па 30 цэнтнераў з гектара. Калгас «Чырвоны прапаўнік» з кожнага гектара тарфянікаў атрымаў па 650 цэнтнераў капусты.

Вялікі ўраджай сена з залужанай плошчы атрымалі калгасы «Чырвоная дубрава» і «Чырвоны молат», Рагачоўскага раёна. Калгас «Пролетарый», гэтага раёна, з плошчы ў 6,2 гектара тарфянікаў зняў на 45 цэнтнераў карэнняў кокасгыза.

Вялікая работа па асушцы балот і асваенню новых зямель будзе праведзена сёлета. Намечана асушыць па абласці 13 тысяч гектараў балот. На стыку Жлобінскага, Рагачоўскага і Будакапалеўскага раёнаў будзе асушан вялікі балотны масіў.

На рэгуліроўцы ракі Іўня-Бонла на асушцы забалочаных зямель у гэтым годзе будуць працаваць тры экскаватары. У калгасах абласці зараз ідзе вялікая падрыхтоўка да масавай асушкі і асваення балот: загатаўліваюцца інструменты, ідзе раскарчоўка хмызнякоў.

За масавую расчыстку сенажацей

ЛАГОЙСК. (Спец. кар. «Звязды»). У 1939 годзе некалькі калгасаў раёна атрымалі першыя ўраджаі зернавых культур, пасеяных на асушаных балотах. Гэта яшчэ больш натхніла калгаснікаў на далейшае разгортванне меліярацыйных работ і асваенне новых ураджайных зямель. За лета мінулага года па раёну было асушана 411 гектараў балот, з якіх 111 гектараў паднята пад веснавы пасеў яравых культур.

Адказваючы на выклік бягомльскіх калгаснікаў, калгаснікі Лагойскага раёна пачынаюць падрыхтоўку да масавай асушкі балот і паляпшэння забалочаных сенажацей. Калгас імені Карла Маркса, Астрашыцкага сельсовета, які ў мінулым годзе асушыў і ўзараў пад пасевы 30 гектараў балот, намеціў ачысціць ад хмызнякоў і ўпаракаваць усе забалочаныя сенажаці. Вясной 8 гектараў малаўраджайнай сенажаці будзе прабаранавана і ўгноена попелам і іншымі мясцовымі ўгнаеннямі.

На тэрыторыі калгаса ім. Карла Маркса ёсць 9 невялікіх забалочаных участкаў, якія таксама будуць упарадкаваны і ператвораны ў сенакосы.

Калгас «Полымя» ў бліжэйшыя дні прыступае да зімовай расчысткі забалочаных сенажацей ад хмызнякоў.

Хірург Леміш

З пачуццём вялікай адказнасці за жыццё чалавека Леміш прыняўся за справу.

Пакуль хапала сіл, Міхей Наварка, амаль самы старэйшы жыхар палескай вёскі Руловін, выходзіў на ганак і, прысеўшы на прызьбе, грэўся ў апошніх праменнях восеньскага сонца. Затуманенымі вачыма ён доўга пазіраў на парыжэлыя загоны, на саламяныя страхі шэрай вёскі. «Вось і ўсё. Аджыў сваё, адгараваў,— думаў Міхей. — Не плаваць больш у рыбацкім чаўне, не ўзмахваць вёсламі ў зараслях ракітавых... Прыходзіць канец».

Думы плылі, як гэтыя белыя павуцінкі бабінага лета, што мякка асядалі на запалыя шчокі Міхея, на выцвілушыя скроні, на пасівелую бараду. І старому палешуку было прыемна казытанне серабрыстых павуцінак.

А жыццёвы круг Міхея з кожным днём звужаўся. Боль у страўніку павялічваўся, жар распаўзаўся па ўсяму целу, прыліваў агнём да галавы, кідаў то ў пот, то ў дрыжыкі. І Міхею цэлымі днямі прышлося ляжаць на печы. Ён не ў сілах быў зрабіць ні кроку па хаце. Міхея лячылі зёлкамі, акурвалі, загаварвалі.

— К доктару-б яго, у жываце штось гніе.

— Ясная справа — у жываце... Час прышоў. Навошта-ж да доктара?

Вочы старога блішчэлі ад жару, сухія губы шавяліліся, штосьці шапталі.

Пасля доўгай рады рашылі Міхея адвезці ў г. Пінск, у больніцу. Стары ўпіраўся і ніяк не мог згадзіцца, што ад смерці ёсць ратунак.

— Час мне прышоў. Ад смерці не ўцячэш.. Як ні бяжы — не ўцячэш... Дагоніць...

...Гарадская больніца. Паклалі Міхея ў сонечным, светлым пакоі. Малады хірург Хаім Рувімавіч Леміш устанавіў цыягназ— лопнуўшая язва страўніка. Патрэбна хуткая аперацыя.

Стары не здаваўся.

— Дзяцей вырасціў... Унукаў прычакаў. Прышла мая чарга...

Часу траціць нельга Хірург Леміш звярнуўся да галоўнага ўрача. Аперацыя была дазволена.

Ён прымяніў усё сваё майстэрства, усё ўменне. Аперацыя была зроблена ўдала. Жыццё выратавана. Хірург Леміш узяў старога Міхея пад свой асабісты нагляд. І днём і ноччу ён наведваўся ў палату, аглядаў хворага, рабіў уколы, прыпісваў патрэбныя лякарствы.

Мінула некалькі дзён. Стары паляшук устаў з ложка і падышоў да шырокага акна. Вочы яго праяснелі. На сэрцы палягчэла. Боль спыніўся. Перад ім раскрываўся знаёмы палескі пейзаж: высокія рыжыя стагі сена, бліскучае возера, на хвалях гойдаюцца рыбацкія чоўны, чародкамі кружацца і палаюць у вытокі качкі. Гарызонт падпіраюць высокія лясы, з якімі ён, Міхей, разам мок, булучы пастушком, мёрз сцюдзёнымі зімамі на лесараспрапоўках.

Падышоўшы да люстэрка, ён доўга разгладжваў сваю ўскуплачаную галаву, жорсткую баразду.

— Зрэзаць гэтую чортаву шаршавіну. Фізіяномію псуе.

Старога падстрыглі, пабрылі, апранулі ў новую кашулю і ён памалаўзеў на поўвека.

Выпісаўшыся з больніцы, Міхей зайшоў у кабінет да хірурга. Леміш быў сур'ёзна чымсьці заняты і не заўважыў увайшоўшага. Стары доўга таптаўся ля парога, потым падышоў да Хаіма Рувімавіча, паклаў яму на плячо сваю сухую, жылістую руку і шчыра сказаў:

— Вы мне, даражэнькі, дапамаглі ўцячы ад смерці.

— Рана вам думаць аб смерці.

— Стары я, а паміраць не хацелася... Ох, як не хацелася. — Падумаўшы, ён дадаў: — Бог без душы, дык юбры чалавек памілаваў, ад смерці збавіў. Вялікае вам дзякуй, таварыш.

* * *

Марыя Нікалаеўна, сялянка вёскі Дубой, Ганцэвіцкага раёна, ляжала нерухома. Тэмпература з кожнай хвіліной павышалася. Цень смерці ляжала на твары. Хворую наведвалі далёкія і блізкія суседзі, знаёмыя. Ціхенька прычынялі дзверы, пераступалі парог, прабіраліся ў хату.

— Вось і памірае Мар'я.

— Адхадзіла, адпрала сваё Мар'я.

— Ціха засынае.

А Мар'я спякала крывёю.

І ў гэты трывожны час на барацьбу са смерцю з'явіўся хірург Хаім Рувімавіч Леміш. Ён вызначыў дыягназ. Спыніў крывяцячэнне. Зрабіў пераліванне крыві. Хірургічнае майстэрства, майстэрства совецкага ўрача перамагло смерць. Мар'я Нікалаеўна Ляшчук адваявана, вернута да жыцця.

* * *

У рабочага-стаханаўца фанернага завода — заварот кішок. Даставілі ў больніцу ноччу. Хворы быў пры смерці. Майстэрства і здольнасць урача Леміша выратавала жыццё рабочаму.

— Вы мяне ўваскрасілі з мёртвых. Вы мой збавіцель, — радуецца рабочы.

* * *

Ярка гарыць святло. Хаім Рувімавіч Леміш сядзіць ля стала ў сваім пакоі і праглядае пісьмы. Пішуць з вёсак, з мястэчак, з самых далёкіх хутароў абласці. Знаёмыя імёны, прозвішчы. Усе гэтыя людзі былі ў яго хірургічным аддзяленні, усіх ён разумна, цвёрда алстойваў, абараняў ад смерці, усім ім вярнуў жыццё.

— Доўга думала, падбірала словы падзякі, — піша аперыраваная Лемішам служачая тав. І, — але вы вышэй за ўсе падзякі. Вы проста сапраўды совецкі ўрач.

Ад гэтых слоў у Леміша на сэрцы становіцца хораша. Ён сядзіць і доўга думае. Яму ўспамінаецца яго маленства, вучоба, яго жыццё, поўнае смутку і цяжкасцей.

Цёмны, сыры падвал. Бацька шавец. Ладзіць старыя бацінкі. Прывучае і яго, Хаіма, шавецкаму рамяству. Ён суча, глянпуе ў братву.

— Прывучайся, сынок. На свой кусок хлеба пераходзь. Не ўпраўляецца адзін бацька, — павучае маці.

Хаім узняўся, падрос. Прагне вучыцца, але нельга. Ён бяднак, ды к таму яўрэй. Вучоба даступна толькі багатым. Такія парадкі, такія законы ў панскай Польшчы.

Хаім дастае кніжкі. Далёка за поўнач у падвале шаўца Рувіма блішчыць газоўка. Хаім чытае...

Мінула некалькі год. Хаім Рувімавіч за апошнія грошы купляе білет у горад Ліён: «Там, кажуць, у Францыі, можна як-небудзь вучыцца... Там жыве цётка...» І Хаім пакідае родны горад, бацькоў, сяброў.

— Дзень юбры, Ліён! — крычаць пасажыры і выходзяць па вакзал. Выходзіць і Хаім. Чым сустрэнеш, дзе прытуліш белака? Суровы Лён, не ветлы. Хаім сядзіць на вакзале: «Куды падацца? Наняцца працаваць і вучыцца... Вучыцца і працаваць!»

Рэстаран. Вечарэе. Хаім запальвае атні, мые пасуду, падлогі... Днём вучыцца ў Ліёнскім хірургічным універсітэце. Прафесар лекцыю чытае на французскай мове. Хаім па слоўніку вывучае чужую, незразумелую яму мову.

...Універсітэт закончан. Малады хірург Хаім Рувімавіч Леміш прыязджае ў родны горад Пінск. Дома ні кавалка хлеба. Трэба працаваць.

— Дайце работу.

— Работы няма, — адказваюць Лемішу ў адным месцы.

— Урача нам не трэба. І без хірургаў хамы абыйдуцца,—адказваюць у другім месцы.

І, нарэшце, як чароўны сон: прыходзіць чырвонае войска. Рухнулі старыя парадкі. Пачалося новае жыццё. Хаім Рувімавіч Леміш атрымаў работу. Яго акружылі ўвагай. Яго работу цэняць і паважаюць. За адданую, чэсную працу яго выбіраюць дэпутатам гарадскога совета. На яго імя прыходзяць пісьмы, поўныя ўдзячнасці за выратаваныя жыцці. Як радасна працаваць, як хочацца працаваць, аддаваць усё сваё ўменне, свае веды дарагой радзіме, любімым людзям, якія цэняць і паважаюць тваю працу, твае здольнасці!

А. БЯЛЕВІЧ.

г. Пінск.

ФІЗАЛІС—КАШТОЎНАЯ ГАРОДНАЯ КУЛЬТУРА

Фізаліс, або мексіканскі тамат, — гародная культура, якая пакуль што мала распаўсюджана ў БССР. Ён нагадвае дробныя памідоры. Развядзенне гэтай культуры вельмі простае. Яна не патрабуе асаблівага догляду, расце на самых звычайных глебах. Плады фізаліса выспяваюць у канцы жніўня.

Фізаліс разводзіцца ў некаторых раёнах рэспублікі. У калгасе «Чырвоны лётнік», Бабруйскага раёна, у 1938 годзе ім была высаджана вопытная ізялянка. У 1939 і 1940 гг. пасадзілі па 0,20 гектара. Было сабрана па 5 тон плаўоў, якія зданы Бабруйскаму плодакансервнаму заводу. Калгас атрымаў за іх 2.000 рублёў. Такім чынам з 1 гектара можна атрымаць да 10.000 рублёў даходу.

Звянявая калгаса «Чырвоны лётнік» тав. Х. Фукс добра асвоіла працэс варжі варэння з плаўоў фізаліса. Па сваёй якасці яно не ўступае варэнню лепшых ягадных сартоў. Адзін кілограм абыходзіцца не даражэй 3-х рублёў.

Неабходна, каб зямельныя органы і Наркамхарчпром заняліся развядзеннем фізаліса ў больш шырокіх размерах. Плады яго з'яўляцца каштоўнай сыравінай для кансервна-патачных заводаў.

К. А. ІОСЕЛЕВІЧ.

АСВАЕННЕ МАЛЫХ РЭК

ГОМЕЛЬ, 25 студзеня. (БЕЛТА). Кантора малых рэк Днепра-Дзвінскага параходства правядзе ў гэтым годзе шырокія работы па палепшэнню рачной сувязі раёнаў з абласнымі цэнтрамі. Будзе праведзена далейшае асваенне ракі Бесяд, прапякаючай у раёне Свяцілавіч. На ачышчэнне грунту і ўмацаванне берагоў яе адпушчана 356 тысяч рублёў. Рака стане судналодкай на працягу 96 кіламетраў. Будзе таксама праводзіцца далейшае асваенне ракі Друць.

Наркамат рачнога флота СССР уключыў у план Днепра-Дзвінскага параходства на 1941 год будаўніцтва мелкасядзячых барж для малых рэк.

ЗА РУБЯЖОМ

Становішча ў Румыніі

БУХАРЭСТ, 25 студзеня. (ТАСС). Румынскае тэлеграфнае агенцтва публікуе камунікэ генерала Антанеску. У гэтым камунікэ Антанеску прапануе ўсім рабочым і служачым пад пагрозай звальнення неадкладна прыступіць да работы. Ён патрабуе ад улад паведаміць аб магчымых пэнтрах супраціўлення з тым, каб падаўляць іх неадкладна. Асобы, якія страляюць з памяшканняў, а таксама займаюцца грабяжом, гаворыцца ў камунікэ, будуць расстрэльвацца на месцы.

БУХАРЭСТ, 25 студзеня. (ТАСС). Учора па радыё была перадана адозва генерала Бэгулеску, які патрабаваў пакарання бунтаўшчыкоў.

Сёння ў паменшаным фармаце выйшлі толькі газеты «Курэнтул», «Універсул» і «Тімпул». Газеты публікуюць камунікэ генеральнай дырэкцыі паліцыі аб тым, што ў Бухарэсце парадак адноўлен. Аднак многія раёны Бухараста астаюцца да гэтага часу ачэпленымі войскамі і рух у гэтых раёнах забаронен. Па ўсяму гораду вывешан загад аб забароне збірацца групамі больш 3 чалавек пасля 10 гадзін вечара. Усе грамадскія прадпрыемствы павінны канчаць сваю работу да 9 гадзін вечара.

Газеты публікуюць таксама заяву генерала Драгаліны, які абвяргае паведамленне аб тым, што ён стаіць на баку легіянераў і выступіў на чале сваёй арміі з Брашова ў Бухарэст для аказання дапамогі легіянерам у іх барацьбе супроць Антанеску.

НЬЮ-ЙОРК, 25 студзеня. (ТАСС). Паводле паведамлення карэспандэнта агенцтва Асошыэйтэд Прэс з Бухарэста, становішча ў асобных раёнах Румыніі да гэтага часу няяснае, асабліва ў гаралах Брашове, Джурджу, Канстанцы, Плоешці, Кымпіне і Крайове. Па сцвярджэнню жалезнагвардзейцаў, яны ўтрымліваюць кантроль над гэтымі гарадамі. Аднак, камандаванне арміяй абвяргае гэта. Колькасць афяр у выніку баёў у Румыніі невядома, але шпіталі Бухараста перапоўнены раненымі.

Антанеску. паведамляе далей карэспандэнт, адлаў распараджэнне неадкладна сузіць паўстанцаў. Урад аддаў распараджэнне ваенным судам сузіць арыштаваных на прапягу 24 гадзін пасля арышту, а прыгаворы прыводзіць у выкананне на прапягу 10 гадзін пасля іх вынясення. Грамадзянскаму насельніцтву прапанавана здаць усю зброю.

БУХАРЭСТ, 25 студзеня. (ТАСС). У час вулічных баёў у Бухарэсце былі забіты сотні легіянераў. Тысячы легіянераў арыштаваны. Усюды па вуліцах горада відаць сляды баёў: валяюцца перавернутыя і абгарэлыя аўтабусы, сцены дамоў зрашэчаны кулямі. Парк Філіпеску, дзе ішлі баі паміж войскамі і легіянерамі, і зараз нагадвае ваенны лагер.

БЕЛГРАД, 24 студзеня (ТАСС). Прыбыўшыя з югаслаўска-румынскай граніцы паведамляюць, што 23 студзеня чыгуначныя зносіны паміж Румыніяй і Югаславіяй былі спынены. Пасажыры, прыбыўшыя ў Югаславію з апошнім поездам з Румыніі, расказваюць, што ў краіне ўсё яшчэ панае беспарадак. Паведамляюць таксама, што мяцежнікі ўтрымліваюць у сваіх руках уладу ў невялікіх гаралах і мястэчках, дзе няма ваенных гарнізонаў.

У журналісцкіх кругах сцвярджаюць, што ў горадзе Тімішоара ідуць вулічныя баі. Частка войск перайшла на бок мяцежнікаў. Аднак большая частка арміі ўдзельнічае ў падаўленні легіянерскага мяцежа.

НЬЮ-ЙОРК, 24 студзеня. (ТАСС). Як перадае агенцтва Асошыэйтэд Прэс, паўстаўшымі былі заняты радыёстанцыі ў Бухарэсце, Брашове, паштамт і некалькі іншых грамадскіх будынкаў у Бухарэсце, Плоешці і Браіла.

Па ўсёй Румыніі забіта 2 тыс. чалавек. За межамі Бухарэста і асабліва ў румынскай частцы Трансільваніі барацьба прадаўжаецца. Жалезнагвардзейцы прадаўжаюць утрымліваць у сваіх руках гарады Арад, Тімішоара і 4 іншыя невялікія гарады Трансільваніі.

Будапештскі карэспандэнт агенцтва Юнайтэд Прэс паведамляе, што паралак у Румыніі яшчэ не адноўлен. Румынскае радыё перадало загад, забараняючы насельніцтву паяўляцца паблізу галоўнага паліцэйскага ўпраўлення ў Бухарэсце. Антанеску ў сваёй заяве па радыё ўказаў, што ён рэарганізуе сістэму ўпраўлення і пойдзе на кампраміс з кіраўніком жалезнагвардзейцаў Хорыа Сіма. Выдан дэкрэт аб устанаўленні ваеннага кантролю на ўсіх чыгунках.

БУХАРЭСТ, 24 студзеня. (ТАСС). У 2 гадзіны 15 мінут па радыё аб'яўлена распараджэнне генерала Антанеску, згодна якога «ўсе ведаючыя месцапрабыванне бунтаўшчыкоў, пачынаючы з Хорыа Сіма і канчаючы апошнім брадзягай, павінны аб іх неадкладна паведаміць уладам. Не выконваючыя гэтага будуць карацца таксама, як і бунтаўшчыкі».

Аднасасова з апублікаваннем гэтага распараджэння войскі пачалі рабіць вобыскі. Вобыск пачаўся з універсітэта, які зараз акружан танкамі і супэльнай сцяной салдат. Вобыскі робяцца таксама ў раёне парка Філіпеску.

БЕРЛІН, 24 студзеня. (ТАСС). Як перадае Германскае інфармацыйнае бюро, совет міністраў Румыніі звярнуўся сёння да насельніцтва па радыё з заклікам указаць месцазнаходжанне асоб, прымаўшых удзел у сутычках апошніх дзён. Да іх у адозве прылічаецца таксама кіраўнік легіянерскага руху Хорыа Сіма.

БУХАРЭСТ, 25 студзеня. (ТАСС). У час бесспаракладу, меўшых месца 21—23 студзеня, жалезнагвардзейцы наладжвалі яўрэйскія пагромы. Учора рад журналістаў наведаў яўрэйскія раёны Бухараста. Яны прадстаўляюць жуднае відовішча. Сотні яўрэйскіх магазінаў у раёнах Вакарэшць, Дудзешць і іншых разгромлены. Многія магазіны спалены. Спалена некалькі сінагог. Вялікая колькасць яўрэяў забіта. Ёсць забітыя і прапаўшыя без весці.

ДЗЕЯННІ ІТАЛЬЯНСКАЙ І ГЕРМАНСКАЙ АВІЯЦЫІ Ў МІЖЗЕМНЫМ МОРЫ

РЫМ, 25 студзеня. (ТАСС). Паводле паведамлення агенцтва Стэфані, злучэнні германскага авіяцыйнага корпуса і італьянскай авіяцыі зрабілі ў раёне востраваа Крыт налёт на англійскую эскадру і падвергілі яе ўзмоцненай бамбардыроўцы. Бомбамі буйнага калібра пашкоджаны два лінкоры і адзін крэйсер праціўніка.

ПАВЕДАМЛЕННЕ АМЕРЫКАНСКАЙ ДЫПЛАМАТЫЧНАЙ МІСІІ Ў САФІІ

НЬЮ-ЙОРК, 24 студзеня. (ТАСС). Паводле паведамлення агенцтва Юнайтэд Прэс, амерыканская дыпламатычная місія ў Сафіі заявіла, што эмісар Рузвельта палкоўнік Донавен згубіў у Сафіі бумажнік, у якім былі пашпарт, грошы і рэкамендацыйныя пісьмы. Ніякіх іншых дакументаў у бумажніку не было. Сафійская паліцыя вядзе расследаванне.

Харчовае становішча Швецыі

СТАКГОЛЬМ, 24 студзеня. (ТАСС). 22 студзеня старшыня шведскай дзяржаўнай харчовай камісіі Хамаршэльд выступіў па радыё з дакладам на тэму: «Ці экспартыруе Швецыя прадукты харчавання?» Хамаршэльд аправерг чуткі аб тым, што Швецыя экспартыравала за граніцу масла ўжо ў той перыяд, калі яго не хапала нават для ўнутранага спажывання ў краіне. Ён заявіў далей, што ў бліжэйшым будучым нельга разлічваць на колькі-небудзь значны імпарт сыравіны для вытворчасці маргарына. Перайшоўшы да пытанняў снабжэння хлебам, Хамаршэльд заявіў, што за апошні час Швецыя экспартыравала 10 тыс. тон зерна ў Фінляндыю і 150 тон насення ў іншыя краіны, што з'яўляецца нязначнай колькасцю ў параўнанні з спажываннем у краіне і з імпартам зернавых у Швецыю. З ліпеня 1940 г. экспарт жывых свіней поўнасцю спынен. Экспарт яек спынен з кастрычніка 1940 г. Экспарт рыбы дазваляецца толькі з асобага дазволу дзяржаўных органаў. «Што-ж датычыць пасылкі прадуктаў у дапамогу Фінляндыі і Нарвегіі, — указаў Хамаршэльд, — то па многіх прычынах было вырашана такіх пасылак прадуктаў у сучасны момант не адпраўляць».

ВАЙНА Ў АЛБАНІІ І АФРЫЦЫ

(Агляд ваенных дзеянняў з 18 па 25 студзеня)

На фронце ў Албаніі за апошні тыдзень адбыліся дзве заслугоўваючых увагі падзеі — выхад грэчаскіх войск на подступы да Валоны і ўзмацненне італьянскіх войск на ўсім фронце.

Не гледзячы на моцнае процідзеянне італьянскіх войск, грэчаскія часці прадаўжаюць павольна прасоўвацца ў напрамку да Валоны і, як паведамляюць амерыканскія карэспандэнты, пачалі акружаць горад з трох бакоў. 23 студзеня грэчаскія войскі знаходзіліся ўсяго за 20 клм. ад Валоны. Страта Валоны, на якую базіруецца 11-я італьянская армія, можа значна ўскладніць становішча італьянскіх войск, бо ў іх у гэтым выпадку астанецца адзін толькі порт Дураццо, на які базіруецца 9-я армія і дзеючы на цэнтральным участку фронта альпійскі корпус.

Каб спыніць прасоўванне грэчаскіх войск на паўднёвым участку фронта, італьянскія войскі пры падтрыманні танкаў і авіяцыі прадпрымаюць энергічныя контратакі, пераходзячыя ў жорсткія рукапашныя схваткі.

Жорсткія баі са зменным поспехам адбываюцца таксама ў раёне Тэпелене і на поўнач ад Клісуры. На астатніх участках фронта за прайшоўшы тыдзень становішча не змянілася.

Паводле паведамлення замежных карэспандэнтаў, у Албанію прыбыло 18 свежых італьянскіх дывізій. Да гэтага часу прыбываючыя па частках італьянскія падмацаванні ў розны час уводзіліся ў бой для аднаўлення становішча на асобных участках фронта; італьянскае камандаванне такім чынам не мела магчымасці сканцэнтраваць у сваіх руках моцную групу войск для манёўра.

У сувязі за значным узмацненнем італьянскіх войск у Албаніі можна чакаць на працягу бліжэйшых аднаго—двух тыняў разгортвання буйных аперацый на гэтым фронце, і, у прыватнасці, на яго паўднёвым участку. Грэчаскае камандаванне пачало прымаць меры па ўмацаванню захваченых пазіцый.

***

У Лівіі англійскія войскі ва ўзаемадзеянні з авіяцыяй і ваенна-марскім флотам атакавалі Тобрук, дзе абараняласа італьянская дывізія 22 армейскага корпуса і некалькі дробных часцей, у атацы прымалі ўдзел тры аўстралійскія дывізіі, падтрымліваемыя двума палкамі артылерыі, дзве бронетанкавыя дывізіі і злучэнне французскіх механізаваных часцей старонніка генерала дэ Голя. Перад атакай Тобрук падвергся ўзмоцненай бамбардыроўцы англійскага ваенна-марскога флота. Атака пачалася на світанні 21 студзеня і прадаўжалася ўвесь дзень пры безупынным падтрыманні авіяцыі. К канцу дня аўстралійскім часцям удалося пранікнуць ва ўсходнюю частку ўмацаванняў, акружаючых горад. Жорсткі бой за Тобрук прадаўжаўся ўсю першую палавіну наступнага дня, і пасля палудня 22 студзеня аўстралійскія войскі занялі горад. Англійскія войскі прадаўжаюць наступленне на захад ад Тобрука.

Вялікую дапамогу англійскім войскам, дзеючым у Лівіі, прадаўжае аказваць ваенна-марскі флот не толькі бамбардыроўкай італьянскіх пазіцый, але таксама і снабжэннем перадавых часцей боепрыпасамі і харчамі, выгружаемымі непасрэдна на ўзбярэжжы Лівіі.

Вайна ў Лівіі набывае зараз для Англіі асабліва вялікае значэнне ў сувязі з арганізацыяй немцамі сваёй авіяцыйнай базы на востраве Сіцылія.

***

Актывізіраваліся таксама ваенныя дзеянні ва Ўсходняй Афрыцы. Тут заслугоўвае ўвагі ўзяцце англічанамі Касалы і далейшае іх прасоўванне ў напрамку на Агордат-Асмара-Масаўа.

Як вядома, Касала з'яўляецца ўваходнымі варотамі з Эрытрэі ў Англа-Егіпецкі Судан і назад. Са стратай Касалы італьянцы страцілі вельмі выгадныя пазіцыі, прыкрываючыя напрамак на Масаўа — важнейшую італьянскую ваенна-марскую базу ў Красным моры.

Капітан Н. АНДРЗЕЎ.

РЫХТУЮЦЦА ДА УСЕАРМЕЙСКАГА ЛЫЖНАГА КРОСА ІМЕНІ С. К. ТІМАШЭНКА

ЗахАВА, 25 студзеня. (БЕЛТА). У падраздзяленнях Н-скай часці ідзе ўзмоцненая падрыхтоўка да ўсеармейскага лыжнага кроса імені Героя і Маршала Савецкага Саюза С. К. Тімашэнка. Згодна палажэння, у кросе прымуць удзел тыя байцы і камандзіры, якія здадуць нормы па лыжах на значок ГПА 1-й ступені.

У падраздзяленні лейтэнанта Тіткова нормы па лыжах здала 93,8 проц. чырвонаармейцаў, у падраздзяленні, дзе камандзірам лейтэнант Сяргееў, нормы здалі ўсе чырвонаармейцы.

Днямі ў падраздзяленні тав. Калупаева адбыліся начныя тактычныя вучэнні на лыжах на тэму «Адзяленне ў абароне ноччу». Байцы выдатна завяршылі марш на лыжах, добра арыентываваліся на мясцовасці.

Лыжныя паходы адбываюцца ў часці штодзённа.

ЛЫЖНЫ КРОС КАЛГАСАЎ

Зараз у сельскіх раёнах рэспублікі праходзяць лыжныя кросы калгасаў. Гэтыя кросы з'явяцца адной з форм падрыхтоўкі калгаснай моладзі да Усесаюзнага комсамольскага кроса імені XXIII гадавіны Рабоча-Сялянскай Чырвонай Арміі. Дыстанцыя кроса — 10 кілометраў для мужчын і 3 кілометры для жанчын.

У радзе раёнаў Мінскай абласці — Заслаўскім, Лагойскім, Дзержынскім і інш. —сотні калгаснікаў ужо выходзілі на старты. З 767 удзельнічаўшых у кросе калгаснікаў нормы на значок ГПА здалі 527 чалавек.

Цікава таксама праходзіць прафсаюзны крос. На 23 студзеня ў ім удзельнічала 5.635 чалавек, з іх—2.353 здалі нормы на значок ГПА.

ЗАПАСЫ ТОРФУ Ў БССР

Выйшаў з друку першы том тарфянога кадастра, складзенага грунтай торфу Упраўлення водная гаспадаркі Наркамзема БССР. У гэтай кнізе апісаны ўсе тарфяныя месцараджэнні ўсходніх абласцей БССР і дана ім тэхнічная ацэнка.

5.105 тарфяных месцараджэнняў займаюць плошчу ў 1.043 тысячы гектараў. Прамысловыя запасы торфу складаюць 13.965 мільёнаў кубічных метраў. Найбольш багатыя запасы прамысловага торфу ў Мінскай абласці — 33 проц., затым ідуць Віцебская і Палеская абласці. У паўночнай частцы рэспублікі пераважаюць дробныя месцараджэнні. Больш буйныя размешчаны ў Палескай і Мінскай абласцях.

Да кадастра рыхтуецца карта, на якой усе месцараджэнні будуць нанесены ў маштабе 1.300.000.

Цяпер збіраюцца даныя аб тарфяным фондзе заходніх абласцей, на аснове якіх будзе складзен другі том кадастра.

***

З кожным годам шырыцца зацікаўленасць торфу ў калгасах на ўтнаенне і паліва. Калгас «Хваля», Свяцілавіцкага раёна, здабыў у мінулым годзе 8.635 тон торфу і торфа-вівініту на ўтнаенне палёў і 3.350 тон торфу на паліва.

Усяго ў 1940 годзе калгасы рэспублікі здабылі каля 8 мільёнаў тон торфу на ўтнаенне і 470 тысяч тон на паліва.

Навукова-даследчая работа ў Белавежскай пушчы

Белавежская пушча з'яўляецца дзяржаўным запаведнікам сусветнага значэння і багата самай рознастайнай фаунай і флорай. Тут жывуць зубры, дзікія коні-тарпаны, лосі, алені, казулі, дзікія кабаны, рысі, барсукі, лісіцы і інш.

Навукова-даследчай дзейнасцю ў пушчы займаецца Упраўленне па запаведніках, зоапарках і зоасадах пры СНК БССР.

У бліжэйшы час у пушчы арганізуецца стацыянар Акадэміі навук СССР.

Прэзідыум Акадэміі навук БССР прызнаў мэтазгодным арганізаваць на тэрыторыі Белавежскай пушчы біялагічную станцыю Акадэміі, якая разам з іншымі навукова-даследчымі ўстановамі будзе вывучаць фауну і флору Белавежскай пушчы. (БЕЛТА).

Новыя песні кампазітара І. Любана

Пасля паспяховага выступлення ў калгасным фестывалі ансамбль песні і пляскі Беларускай ордэна Працоўнага Чырвонага Спяга філармоніі ўзмоцнена працуе над стварэннем новага рэпертуара. Ансамбль ужо развучыў рад новых песень і танцаў. Сярод іх асабліва вызначаецца новая песня «Ой, ты хлопчык кучаравы», напісаная мастацкім кіраўніком ансамбля заслужаным артыстам рэспублікі кампазітарам ордэнаносцам І. Любанам на словы Анастасіі Калеснікавай. Апрача таго кампазітарам апрацавана каля 15 беларускіх народных песень — «Не кукуй, зязюленька», «Ой, у полі буен вецер», «Як пайшоў молад гуляць» і інш.

Падрыхтаваны песні для ансамбля і іншымі кампазітарамі. Рад песень апрацаваў кампазітар Сакалоўскі — «Замуж пайсці—грэбы знаць» і «Ой, доля мая, доля», кампазітар Іваноў напісаў харавоцную песню «Эх, ты сад, вінаград».

Калектыў ансамбля рэпетыруе зараз і новыя танцы ў пастаноўцы балетмейстара ордэнаноснца Алексютовіча, сярод іх народны танец «Маладзянка», яўрэйскі і украінскі народныя танцы.

Кінофестываль для чыгуначнікаў

ЖЛОБІН, 25 студзеня. (БЕЛТА). 24 студзеня ў чыгуначным клубе «Акцябр» пачаўся кінофестываль, прысвечаны XVIII партыйнай канферэнцыі. На працягу месяца чыгуначнікам вузла будзе паказана 26 лепшых савецкіх мастацкіх фільмаў: «Лікаў Сверлоў», «Чалавек з ружжом», «Ленін ў 1918 годзе» і інш.

ПАРТЫЙНЫ АКТЫЎ ВЫВУЧАЕ ЗАМЕЖНЫЯ МОВЫ

БАРАНАВІЧЫ, 25 студзеня. (БЕЛТА). У радзе гарадоў абласці адкрыліся школы замежных моваў для партыйнага актыва. у Баранавіцкай школе нямецкай мовы займаецца 30 чалавек.

Пачаліся канікулы студэнтаў

У Беларускім дзяржаўным універсітэце пачаліся зімовыя канікулы. 40 студэнтаў выехалі ў дамы адпачынку. Многія студэнты прымаюць удзел ва Усебеларускіх міжвузаўскіх лыжных спаборніцтвах, у лыжным кросе профсаюзаў.

1 лютага 10 лепшых лыжнікаў выйдуць у ваенізіраваны лыжны пераход па маршруту Мінск—Баранавічы.

У часе канікул у Беларускі дзяржаўны універсітэт прыязджае дэлегацыя студэнтаў Каунаскага універсітэта. Яна азнаёміцца з вопытам палітыка-выхаваўчай і культурна-бытавой работы БДУ.

Ва ўніверсітэце для студэнтаў арганізуюцца кіносеансы і навукова-папулярныя лекцыі. (БЕЛТА).

Паведамленні

◎ 27 студзеня, у 8 гадзін вечара, у партыйным кабінеце Варашылаўскага РК КП(б)Б (вул. Энгельса, 4) адбудзецца папулярная лекцыя для малодых комуністаў і кандыдатаў ВКП(б) на тэму **«Соцыялізм і комунізм».** Чытае дацэнт Юрыдычнага інстытута тав. **Барон.**

Уваход свабодны.

◎ 27 студзеня, у 8 гадзін 30 мінут вечара, у Доме партасветы (малая зала) адбудзецца лекцыя на тэму **«Развіццё матэрыялістычнай філасофіі ў Расіі ў 40—80-х гадах».** Чытае кандыдат філасофскіх навук тав. **Чымбург.**

Уваход па абанементу філасофіі і разавых білетах.

Білеты можна купіць у кандылярыі і бібліятэцы Дома партасветы і ў райкомах КП(б)Б.

ШАХМАТЫ

Зімовы конкурс рашэнняў

Эцюд № 4



Белыя: Крf5, Кf7, п. а5 (3).
Чорныя: Крd5, пп. С4, h5 (3).
Белыя пачынаюць і выйграюць

Эцюд № 5



Белыя: Крb2, Лс8, Сg1, (3).
Чорныя: Крf7, Кс3, пп. а2, е2, (4).
Белыя пачынаюць і робяць нічыю.

Апошні тэрмін адсылкі гэтых рашэнняў—7 лютага.

СТАНОВІШЧА Ў КОНКУРСЕ РАШЭННЯЎ

Правільнае рашэнне ўсіх задач і эцюдаў № 1—3 атрымана ад тт. Марголіна, Фрэйдліна, Ткача, Севасц'янава, Гаварэня; усіх задач і эцюда № 1 — Дакучыца, Шуспероміча, Кобленца, Малажэўскага, Шустэрмана; усіх і задач: Каплана, Гофмана. Статкевіча, Паскан'ева, Маслоўскага, Пацехіна, Завадскага Кандраценка, Гершановіча, Пастаялкава, Тарлера, Шумахера; задач № 1—7: Айдэльмана Домніча, Шубава, Левіна, Мільгоціна, Гозенпуда, Цюлякова, Партона.

Чакаецца папраўка задачы № 7, у сувязі з дабаўленнем каня, ад тт. Эйхеля, Трушнікова, Макеева, Руссцкага, Сеўрука, Розенблюма, Доўбіка, Козіка, Цырлина, Шабуні, Жывапісцава, Сікіржыцкага, Татаржыцкага, Панамарова, Куракевіча, Вікенцьева, Селяўдова.

Няправільнае рашэнне задачы № 8 атрымана ад тт.: Кімарова, Магонава, Паршына, Маляўцева, Ліхтароніча, Ліпшая, Ліпанкова, № 1 — Шабуні, Сікіржыцкага, Селяўдова, Герта Трухана, Сеўрука, Розенблюма, Доўбіка, № 2 —Звагельскага, Эйхеля, Курапаценкава, Герта Трухана, Сеўрука, Розенблюма. Сгненко. Цырлина, Шабуні, Сікіржыцкага.

Не атрымана або атрымана памылковае рашэнне задачы № 1 ад: Бельскага, Розенблюма, Доўбіка, № 2 — Львовіча, № 3 — Розенблюма.

Усе папраўкі, дадаткі або ўключэнне ў конкурс новых удзельнікаў (гл. «Звязду» за 19/I) магчыма да 30—31 студзеня па паштовым штэмпелю. Ніякіх далейшых паведамленняў аб няправільных рашэннях ні поштай, ні праз адзел пасылашча з-за недахопу часу не будзе.

У конкурсе гурткоў, які закончан заданнямі 19/I, становішча наступнае: усе прысланыя рашэнні правільныя: Макранская СШ, 8-школа гор. Віцебска, 12-я школа гор. Полацка, Пагосцкая СШ, З Н-скага падраздзялення, прыслана памылковае рашэнне задачы № 3 гурток Мядзельскага Дома сацкультуры № 6, гурток Слабодскай СШ № 8. Ад астатніх гурткоў атрымана яшчэ мала рашэнняў. Усе папраўкі і дадатковыя рашэнні могуць быць прысланы не пазней 30—31 студзеня па паштоваму штэмпелю.

РАШЭННІ ЗАДАЧ НОВАГОДНЯГА КОНКУРСА «Звязда» 1 студзеня

Мат у адну чвэрць хода. Становішча на дошцы адлюстроўвае момант доўгай ракіроўкі белых: кароль перастаўлен з поля е1 на поле с1 (поўхода). Ладзя, якой няма на дошцы, знята з поля а1 і знаходзіцца ў руцэ. Ставім ладзю на поле d1! Мат. 1 ў чвэрць хода!

Мат у 3/4 хода. Чорныя зрабілі апошні ход е7 — е5. На поле f5 стаяла белая пешка. Знімаем пешку е5 з дошкі ўзяццем на праходзе (½ хода). Ставім пешку, што знаходзіцца ў руцэ на шляху да поля е6, на гэта поле (¼ хода). Мат 1 ў ¼+¼—¾ хода. Інакш гэтыя задачы рашыць нельга. Некаторыя больш фантастычныя прапановы, прысланыя рашацелямі, адыходзяць ад правілаў шахматнай гры.

Правільнае рашэнне абодвух задач атрымана ад тав. Мільгоціна (Полацк) і таварыша Мінска, які забыў напісаць сваё прозвішча ў пісьме (просім паведаміць). Правільнае рашэнне першай задачы наступіла яшчэ ад тав. Курапаценкава (Слабодка, Магілеўская раёна).

Адказны рэдактар Т. С. ГАРБУНОЎ.

ДЗЯРЖАЎНЫ ОРДЭНА ЛЕНІНА ВЯЛІКІ ТЭАТР ОПЕРЫ І БАЛЕТА БССР

26 студзеня ЛЕБЯДЗІНАЕ ВОЗЕРА. Пачатак у 8.30 веч.
28/I спектакль для школьнікаў і студэнтаў — МІХАСЬ ПАДГОРНЫ. Пачатак у 6.30 веч.

ПЕРШЫ БЕЛАРУСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ ОРДЭНА ПРАЦОЎНАГА ЧЫРВОНАГА СЦЯГА ДРАМАТЫЧНЫ ТЭАТР

26 студзеня ПЛАТОН КРЭЧЭТ. Пачатак у 8.30 веч. Бліжэйшая прэм'ера «ФЛАНДРЫЯ».

ДЗЯРЖАЎНЫ ЯЎРЭЙСКІ ТЭАТР БССР

26 студзеня ЦВЕЙ КУНІЛЕМЛЭХ. Пачатак у 8.30 веч. Бліжэйшая прэм'ера — «СЭРКЕЛЕ».

Кінатэатр «Чырвоная зорка» МАКАР НЕЧАЙ

Кінатэатр «Радзіма» 1. НА ПУЦЯХ. 2. СІЛА ЖЫЦЦЯ.

Кінатэатр «Інтэрнацыянал» ДЗЯЎЧЫНА З ХАРАКТАРАМ

Кінатэатр «Спартак» «ДРУЗЬЯ ВСТРЕЧАЮТСЯ ВНОВЬ»

Дзіцячы кінатэатр ТІМУР І ЯГО КАМАНДА

Кінатэатр «Навіны дня» 1. Саюзкінажурнал № 2. 2. Кінажурналы №№ 1 і 2 «Савецкая Беларусь». 3. «Зямля без ярма». (кінанарыс).

АКАДЭМІЯ НАВУК БССР аб'яўляе ПРЫЁМ У АСПІРАНТУРУ

ПА НАСТУПНЫХ СПЕЦЫЯЛЬНАСЦЯХ:

ХІМІЧНАЯ ПЕРАПРАЦОЎКА ТОРФУ. БАЛОТАЗНАЎСТВА. ТЭХНАЛОГІЯ ТОРФАЗДАБЫЧЫ. АГРАТЭХНІКА. АГРАХІМІЯ. ГЕНЕТЫКА І СЕЛЕКЦЫЯ СЕЛЬГАСПРАСЛІН. ФІЗІЯЛОГІЯ РАСЛІН І ГІСТАРЫЧНАЯ ГЕАЛОГІЯ.

Прыём у аспірантуру праводзіцца ў адпаведнасці з «Палажэннем аб аспірантуры».

ПРЫЁМ ЗАЯЎ ДА 15 ЛЮТАГА г.г.

Усе даведкі і прыём заяў — па адрасу: МІНСК, вул. ПУШКІНА, 56, АКАДЭМІЯ НАВУК БССР, УПРАЎЛЕННЕ КАДРАЎ.

Да ведама РАЙВЫКАНКОМАЎ, СЕЛЬСОВЕТАЎ І БІБЛІЯТЭК

Ва ўсіх кніжных магазінах і кіёсках УПРАЎЛЕННЯ КНІГАГАНДЛЮ ДВБ, КОГІЗа, ГАЛОЎГАНДЛЯ, РАЙСПАЖЫВСАЮЗАЎ І САЮЗДРУКУ

ЁСЦЬ У ПРОДАЖЫ:

стэнаграфічныя справаздачы Сесій Вярхоўнага Совета СССР

	На рускай мове	На беларускай мове
2-я Сесія	Ц. 7 р. 50 к.	Ц. 9 р.
3-я »	» 15 р.	» 13 р.
4-я Унечарг.	» 8 р. 50 к.	» 7 р.
5-я »	» 3 р. 50 к.	» 2 р. і 3 р.
6-я Сесія	» 12 р.	» 10 р.
7-я »	» 7 р.	» 6 р.

Стэнаграфічныя справаздачы Сесій Вярхоўнага Совета БССР

На беларускай мове:
2-я Сесія Ц. 7 р. 50 к.
3-я Унечарг. » 3 р. 50 к.

ЗАКАЗЫ НАКІРОЎВАЦЬ У АДРАСЫ ГАРАДСКІХ І РАЁННЫХ КНІЖНЫХ МАГАЗІНАЎ.

ДА ВЕДАМА НАСЕЛЬНІЦТВА І УСТАНОЎ г. МІНСКА

АРЦЕЛЬ „МЕБКААПРАМОНТ“ (Мінск, Гандлёвая, 48, тел. №№ 21-052 і 20-585)

ПРАВОДЗІЦЬ РАМОНТ МЭБЛІ

МЯККАЙ І ЖОРСТКАЙ ЯК У МАЙСТЭРНЯХ АРЦЕЛІ, ТАК І Ў ЗАКАЗЧЫКА НА ДАМУ.

ЗАКЛЮЧАЕ ДАГАВОРЫ

з усімі арганізацыямі на 1941 год на бесперабойнае і своечасовае абслугоўванне рамонтам мяккай і жорсткай мэблі.

АБІВАЕ АЎТАМАШЫНЫ ЎСІХ СІСТЭМ. ПРАВОДЗІЦЬ РАМОНТ ЧАМАДАНАЎ, ПАРТФЕЛЯЎ І ДАМСКІХ СУМАЧАК. ЗАКУПЛЯЕ СТАРУЮ МЭБЛЮ.

ПРЫМАЕ ІНДЫВІДУАЛЬНЫЯ ЗАКАЗЫ на ўсякую мэблю, а таксама на пашыўку і навеску розных штор, партэр і драпіровачных работ (з матэрыялу заказчыка).

ЗАКУПЛЯЕ ВЫСОКАЯКАСНУЮ. КАШТОЎНУЮ. СТЫЛЬНУЮ МЭБЛЮ.

МАЙСТЭРНІ АРЦЕЛІ ЗМЯШЧАЮЦЦА: па Рэвалюцыйнай вул., 2; па Чырвонай вул., 45; па Старамясніцкай вул., 6; па вул. Апанскага, 79; па Маскоўскай, 35 і па Аранжэрэйнай, 11.

ПРАЎЛЕННЕ АРЦЕЛІ.

Прадаецца ДОМ 2-гі Брылеўскі завул., 11, Невідовіч.

МЯНЯЮ ПАКОЙ 40 кв. м., сонечны, з выгодамі, у цэнтры, на 2 або 3 пакоі большай плошчы. Даведацца па тэлефону 24-032.

МЯНЯЮ КВАТЭРУ ў Віцебску, асобную, з выгодамі, у цэнтры, на кватэру ў Мінску. Званіць па тэлефону 22-544.

АДРАС РЭДАКЦЫІ І ВЫДАВЕЦТВА: Мінск, Савецкая, 49. Тэлефоны рэдакцыі: адказны рэдактар—20-000 (камутатар), дадатковы—102, прыёмная рэдактара — 2-13-52, намеснік адказнага рэдактара — 2-51-88, адказнага сакратара — 2-13-53, намеснік адказнага сакратара — 2-24-12, сакратарыята — 2-39-55. Аддзелаў: загадчык партыйнага аддзела — 2-18-46, літработнікаў — 2-13-56, загадчык аддзела прапаганды і агітацыі — 2-51-89, загадчык эканамічнага аддзела — 2-08-30, літработнікаў — 2-15-56, літработнікаў па літаратуры і мастацтву, школах, ваенна-фізкультурнай рабоце, унутранай інфармацыі — 2-18-85, аддзела рабселькораў і пісем працоўных — 2-13-60, заг. выдавецтва — 2-13-58, бухгалтэрыі выдавецтва і аддзела аб'яў — 2-08-44, выпускаючага — 2-47-68, характарскай № 2-13-57.

У1028. Мінск, друкарня «Звязды», Савецкая 49. М., М., Ш.